Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

ЛЮТЫ 22 СУБОТА
№ 9 (508)
1941 год
ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Рэзалюцыя па дакладу тав. МАЛЕНКОВА, прынятая XVIII Усесаюзнай канферэнцыяй ВКП(б)

I.

Поспехі і недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) адзначае, што прамысловасць і транспарт Савецкага Саюза ў 1940 годзе значна пайшлі ўперад у справе выканання трэцяга пяцігадовага плана, павялічылі аб'ём вытворчасці, забяспечылі ў значнай ступені далейшы рост народнай гаспадаркі і ўмацаванне абароннай магутнасці СССР.

Прадукцыя сацыялістычнай прамысловасці ў 1940 годзе павялічылася ў параўнанні з 1939 годам на 11 процантаў, прычым тэмпы росту прамысловай вытворчасці ў 1940 годзе сістэматычна нараслі.

Палепшылася, у асаблівасці ў другім паўгоддзі 1940 года, работа раду важнейшых галін прамысловасці. Значна вырасла здабыча вугалю. Выраслі выплаўка чыгуну, сталі і вытворчасць пракату, прычым асабліва павялічыўся выпуск сталей спецыяльных марак і якаснага пракату, якія ідуць на патрэбы кваліфікаванага машынабудаўніцтва і абароннай прамысловасці. Некалькі палепшыла сваю работу таксама каляровая металургія, асабліва па выпуску медзі і алюмінія. Машынабудаўнічая прамысловасць у 1940 годзе дабілася далейшых поспехаў у справе асваення новых відаў складаных машын і станкоў навейшых канструкцый. Тэмпы росту прадукцыі абаронных прамысловых наркаматаў у 1940 годзе былі значна вышэй тэмпаў росту прадукцыі ўсёй прамысловасці.

У рэзультаце поспехаў асваення новай тэхнікі і росту абароннай прамысловасці значна павысілася тэхнічная аснашчонасць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота навейшымі відамі і тыпамі сучаснага ўзбраення.

Некалькі палепшылі сваю работу таксама тэкстыльная, лёгкая і харчовая прамысловасць.

Рост чыгуначных і водных перавозак забяспечыў паляпшэнне снабжэння важнейшых галін народнай гаспадаркі палівам, рудой, металам, лесам і іншымі відамі сыравіны і матэрыялаў.

У справе паляпшэння работы прамысловасці і транспарта ў другім паўгоддзі 1940 года вялікую ролю адыгралі мерапрыемствы партыі і ўрада па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны і пераход на васьмігадзінны рабочы дзень і сямідзённы рабочы тыдзень.

У рэзультаце гэтых мерапрыемстваў вырасла прадукцыйнасць працы, умацавалася працоўная дысцыпліна на прадпрыемствах.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) лічыць, аднак, што побач з поспехамі ёсць таксама сур'ёзныя недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта.

Рад галін прамысловасці, у асаблівасці паравоза- і вагонабудаўніцтва, электрапрамысловасць, лясная, папяровая, рыбная і прамысловасць будматэрыялаў, адстаюць і не выконваюць вытворчых планаў. Нафтавая прамысловасць, хоць і прыкметна палепшыла ў IV квартале 1940 года сваю работу, аднак усё-ж не выканала плана 1940 года. Нават у тых галінах прамысловасці, якія ў цэлым палепшылі сваю работу, ёсць рад прадпрыемстваў, у тым ліку і буйных, якія знаходзяцца доўгі час у стане адставання.

Рад галін прамысловасці нясвоечасова ўводзіць у дзеянне новыя вытворчыя магутнасці.

Па раду галін прамысловасці, у рэзультаце допушчаных перарасходаў сыравіны, матэрыялаў, паліва, электраэнергіі, вялікіх страт ад браку і іншых безгаспадарчых расходаў, не выканан план па зніжэнню сабекошту прамысловай прадукцыі. Асабліва гэта датычыць такіх галін прамысловасці, як нафтавая, лясная, папяровая і будматэрыялаў.

Не гледзячы на паляпшэнне ў 1940 годзе ў рабоце электрастанцый, на электрастанцыях і асабліва ў электрасецях мае месца ўсё яшчэ вялікая колькасць аварый, з прычыны расхлябанасці тэхнічнага персанала і невыконвання правіл тэхнічнай эксплаатацыі. Укараненне новай тэхнікі: пераход на высокі ціск і высокую тэмпературу пара, аўтаматызацыя ўпраўлення агрэгатамі, прымяненне сучаснай хуткадзеючай электраахові — адбываецца марудна і ў недастатковых размерах.

У рабоце транспарта таксама ёсць сур'ёзныя недахопы. На чыгуначным транспарце не выконваюцца ўстаноўленыя нормы абаротаў вагонаў і ўсё яшчэ вялікая колькасць аварый. Рад чыгунак дрэнна спраўляецца з перавозкамі важнейшых грузаў, не арганізавалі як належыць пасажырскі рух і не ліквідавалі спазненняў паяздоў.

У марскім і рачным транспарце дрэнна арганізавана пагрузачна-разгрузачная работа ў портах і на прыстанях, ёсць недахопы ў арганізацыі руху суднаў і ўсё яшчэ вялікая колькасць парушэнняў правіл тэхнічнай эксплаатацыі флота, з прычыны чаго судны часта выходзяць са строю і становяцца на рамонт у час навігацыі.

У рабоце чыгуначных станцый, портаў і прыстаней няма належнай увязкі, што прыводзіць да вялікіх прастояў танажа і рухомага састава, да вялікага затрымання грузаў у пунктах перавалкі.

II.

Прычыны недахопаў у рабоце наркаматаў і партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) лічыць, што нездавальняючая работа раду галін прамысловасці аб'ясняецца перш за ўсё тым, што:

а) наркаматы вядуць сваю работу ва многім бюракратычна, не дабіраюцца яшчэ да кожнага асобнага прадпрыемства, «кіруюць» сваімі прадпрыемствамі не па сутнасці, а фармальна, шляхам папяровай перапіскі;

б) наркаматы не правяраюць выканання сваіх рашэнняў дырэктарамі прадпрыемстваў і абмяжоўваюць, такім чынам, рамкі сваёй кіруючай работы пасяджэннямі калегій і прыняццем рашэнняў, не разумеючы, што рашэнні прымаюцца не для саміх рашэнняў, а для іх выканання, не разумеючы, што галоўную частку кіруючай работы павінна складаць не засядацельская работа і не прыняцце рашэнняў, а паўсядзённая праверка выканання гэтых рашэнняў;

в) многія мясцовыя партыйныя арганізацыі, замест таго, каб дапамагчы прадпрыемствам сваёй вобласці, горада, раёна, аслабілі сваю работу як у прамысловасці, так і на транспарце, няправільна лічачы, што яны не нясуць адказнасці за работу прамысловасці і транспарта;

г) мясцовыя партарганізацыі таксама, як і гаспадарчыя арганізацыі, не разумеюць сэнсу і значэння праверкі выканання і не дапамагаюць з прычыны гэтага наркаматам і главкам наладзіць штодзённую праверку выканання рашэнняў наркаматаў дырэктарамі падпарадкаваных ім прадпрыемстваў.

Многія абкомы партыі, займаючыся сельскай гаспадаркай, справамі загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, закінулі работу ў прамысловасці і на транспарце, забылі аб сваёй адказнасці за работу заводаў, фабрык, шахт, руднікоў, чыгунак сваёй вобласці, горада, раёна, а гаркомы партыі, якія абавязаны галоўную сваю ўвагу ўдзяляць прамысловасці і транспарту, не займаюцца гэтай справай і не прымаюць мер да паляпшэння работы адстаючых прадпрыемстваў і чыгунак.

Гаркомы і абкомы партыі замест таго, каб улазіць у справы фабрык, заводаў, чыгунак, нярэдка стаяць у баку ад прамысловасці і транспарта, не кантралююць работу прадпрыемстваў, не правяраюць кіруючых людзей на фабрыках, заводах і чыгунках, не ўскрываюць недахопаў у іх рабоце і тым самым патураюць гэтым недахопам.

Гаркомы і абкомы партыі звыкліся з тым становішчам, што рад прадпрыемстваў у іх доўгі час знаходзіцца ў глыбокім прарыве і не прымаюць дзейсных мер да таго, каб пакончыць з гэтай ганебнай з'явай.

Асабліва дрэнна гаркомы і абкомы партыі займаюцца прадпрыемствамі і прамысловымі будоўлямі, падпарадкаванымі саюзным наркаматам, памылкова лічачы, што за становішча спраў на гэтых прадпрыемствах і будоўлях адказваюць выключна наркаматы.

Буйным недахопам у рабоце гаркомаў і абкомаў партыі з'яўляецца тое, што яны не ўваходзяць у сутнасць работы прадпрыемстваў, не вывучаюць эканоміку прадпрыемстваў і, замест гэтага, аддзелваюцца часта павярхоўнымі абследваннямі і верхагляцкімі рашэннямі.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) лічыць, што гаркомы, абкомы, крайкомы, ЦК кампартый саюзных рэспублік абавязаны, побач з наркаматамі, несці адказнасць за работу ўсіх прамысловых і транспартных прадпрыемстваў горада, вобласці. Іменна гаркомы, абкомы, крайкомы, ЦК кампартый саюзных рэспублік маюць магчымасць непасрэдна на месцы, найбольш аб'ектыўна, не лічачыся з вузкаведамственнымі інтарэсамі, разабрацца ў становішчы спраў на прадпрыемстве, вызначыць, у чым крыюцца недахопы ў яго рабоце і дапамагчы кіруючым работнікам прадпрыемстваў і наркаматам знішчыць іх.

III.

Гаспадарча-палітычныя задачы партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Якія меры трэба прыняць па лініі гаспадарча-палітычных задач партарганізацый, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта?

1. Перш за ўсё неабходна безумоўна ліквідаваць абыякавыя адносіны партарганізацый да стану прамысловасці і транспарта і рашуча **павярнуць увагу партарганізацый у бок максімальных клопатаў аб патрэбах і інтарэсах прамысловасці і транспарта.**

Неабходна, каб партыйныя арганізацыі сістэматычна ўлазілі ў справы прамысловых прадпрыемстваў, чыгунак, параходстваў і портаў, высвятлялі іх патрэбы і запросы і дапамагалі гаспадарчым арганізацыям у іх штодзённай рабоце па кіраўніцтву прамысловасцю і транспартам.

Партыйныя арганізацыі да гэтага часу галоўную ўвагу ўдзялялі кіраўніцтву сельскай гаспадаркай. І гэта было правільна, пакуль зернавая праблема не была яшчэ вырашана. Але цяпер, калі ў асноўным ужо вырашана зернавая праблема і задача штогадняга атрымання ўраджаю зярна ў 7—8 мільярдаў пудоў, — **неабходна павярнуць партыйныя арганізацыі ў бок прамысловасці і транспарта.** Гэта не значыць, што трэба аслабіць увагу да сельскай гаспадаркі. Але гэта значыць, што партыйныя арганізацыі настолькі выраслі, што яны могуць заняцца **у роўнай меры** і прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

2. Неабходна, далей, каб партарганізацыі дапамагалі наркаматам і главкам правяраць работу дырэктароў прадпрыемстваў, **правяраць выкананне рашэнняў наркаматаў прадпрыемствамі.**

Партарганізацыі павінны ўсвядоміць сабе, што адны толькі наркаматы не ў сілах кантраляваць работу прадпрыемстваў, правяраць выкананне рашэнняў наркаматаў. Таму партарганізацыі павінны дапамагчы наркаматам у справе праверкі выканання дырэктыў наркаматаў прадпрыемствамі, гэта значыць у справе кантралявання работы дырэктароў прадпрыемстваў.

3. Неабходна, далей, каб прамысловыя прадпрыемствы і чыгункі мелі **правільна пастаўлены ўлік абсталявання, усякага роду маёмасці і матэрыялаў.**

Партыйныя арганізацыі павінны ўсвоіць, што без правільнага ўліку нельга кіраваць прадпрыемствам і чыгункай. Работа прадпрыемстваў, дзе адсутнічае колькі-небудзь нармальны ўлік, чрэвата нечаканасцямі. На такіх прадпрыемствах немінучы зрывы вытворчасці, з прычыны нечаканай для кіраўніка нястачы матэрыялаў, паўфабрыкатаў, інструментаў, абсталявання. Запушчанасць ва ўліку абсталявання і матэрыялаў пазбаўляе дырэктара магчымасці правільна і поўнасцю скарыстаць рэсурсы прадпрыемства і забяспечыць бесперабойны ход вытворчасці.

4. Неабходна, далей, каб на нашых прамысловых прадпрыемствах, чыгунках і ў арганізацыях воднага транспарта поўнасцю і **правільна скарыстоўвалася абсталяванне і гаспадарча расходаваліся інструмент, сыравіна, матэрыялы, паліва, электраэнергія.**

Партыйныя арганізацыі павінны зразумець, што час рашуча пакончыць з такой шкоднейшай практыкай, калі на прадпрыемствах і чыгунках прастойвае, а часам і проста ляжыць на складах нямала станкоў і іншага абсталявання, калі дэфіцытнае кваліфікаванае абсталяванне, складаныя вытворчыя агрэгаты, буйныя станкі скарыстоўваюцца не па прызначэнню ці з няпоўнай нагрузкай, а сыравіна, матэрыялы, паліва і электраэнергія расходуюцца марнатраўна.

5. Неабходна, далей, дабіцца, каб на прамысловых прадпрыемствах і на транспарце ўсе **матэрыяльныя каштоўнасці ўтрымліваліся ў захаванасці і ў добрым стане,** каб кіраўнікі прадпрыемстваў берагі давераную ім дзяржаўную маёмасць: будынкі, абсталяванне, інструмент, матэрыялы.

Трэба зараз-жа пакончыць з такімі нядбайнымі і негаспадарскімі адносінамі да народнага дабра, калі абсталяванне, сыравіна, матэрыялы, інструмент, у якіх востра мае патрэбу наша прамысловасць, часта, валяючыся дзе папала, псуюцца, ржавеюць, прыходзяць у нягоднасць, калі нясвоечасовы і нядобраякасны рамонт абсталявання, будынкаў і збудаванняў, рухомага састава чыгунак датэрмінова іх разбурае і выводзіць са строю.

6. Неабходна, далей, **пакончыць з устанавіўшайся на многіх прадпрыемствах і чыгунках практыкай продажу, так званага, дэмантыруемага і лішняга абсталявання і матэрыялаў,** што з'яўляецца не чым іншым, як раскраданнем сацыялістычнай уласнасці.

Партыйныя арганізацыі абавязаны забяспечыць кантроль за найстражэйшым праводзеннем у жыццё Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 лютага 1941 года «Аб забароне продажу, абмену і вопуску на старану абсталявання і матэрыялаў і аб адказнасці па суду за гэтыя незаконныя дзеянні».

7. Неабходна, далей, навесці і штодзённа падтрымліваць **чыстату і элементарны парадак** у прадпрыемствах і на чыгунках.

Партарганізацыі абавязаны вырашыць неадкладна задачу падтрымання чыстаты і парадку на прадпрыемствах, як задачу, якая не церпіць ніякіх адкладанняў. Без чыстаты і парадку немысліма нармальная работа сучаснага прадпрыемства. Гразь ёсць немінучы спадарожнік і крыніца расхлябанасці, расхістанасці дысцыпліны, разбалтанасці, адсутнасці парадку на заводзе, фабрыцы, чыгунцы. Без элементарнай культуры на вытворчасці нельга забяспечыць далейшы ўздым нашай прамысловасці і транспарта.

8. Неабходна, далей, **пакончыць** з бясплановасцю, **з няроўнамерным выпускам прадукцыі,** з штурмаўшчынай у рабоце прадпрыемстваў і дабіцца штодзённага, па загадзя распрацаванаму графіку, выканання вытворчай праграмы кожным заводам, фабрыкай, шахтай, чыгункай.

Партыйныя арганізацыі павінны зразумець, што няроўнамерны выпуск гатовай прадукцыі стварае няправільны рэжым работы прадпрыемства, прыводзіць да прастояў абсталявання, прастояў рабочай сілы, да недавыкарыстання вытворчых магутнасцей, да павелічэння браку, да непрадукцыйных пераплат за звышурочныя работы. Такі няправільны рэжым трымае прадпрыемства ў ліхарадачным стане і ставіць пад пастаянную пагрозу зрыву выкананне ім дзяржаўнага плана.

9. Неабходна, далей, дабіцца на нашых прадпрыемствах захавання **найстражэйшай дысцыпліны ў тэхналагічным працэсе,** увесці на ўсіх прадпрыемствах дакладныя інструкцыі тэхналагічных працэсаў, устанавіць кантроль за іх выкананнем і **забяспечыць,** такім чынам, **выпуск добраякаснай і камплектнай прадукцыі,** поўнасцю адпавядаючай устаноўленым стандартам.

Партыйным арганізацыям, работнікам прадпрыемстваў, наркаматам час усвоіць, што новыя дакладныя механізмы, якімі аснашчаны нашы прадпрыемствы, патрабуюць строгага парадку ў вытворчасці, дакладнага выканання тэхнічных правіл і інструкцый і што цяпер ужо нельга працаваць па-старынцы, уразвалку, сяк-так, на-вока.

Партыйныя арганізацыі абавязаны забяспечыць найстражэйшае праводзенне ў жыццё Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня 1940 года «Аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай або некамплектнай прадукцыі і за незахаванне абавязковых стандартаў прамысловымі прадпрыемствамі».

10. Неабходна, далей, асобую ўвагу ўдзяляць пытанням новай тэхнікі, няспынна **працаваць над удасканаленнем тэхнікі, над асваеннем вытворчасці новых машын, матэрыялаў і вырабаў.**

Партарганізацыі, работнікі прамысловасці і транспарта павінны поўнасцю скарыстаць велізарныя магчымасці сацыялістычнага ладу для росквіту тэхнічнай мыслі і для хутчэйшага ўкаранення новых дасягненняў тэхнікі ў вытворчасць.

Неабходна пакласці канец хвастызму, у корані апартуністычным адносінам да новай тэхнікі з боку часткі кіраўнікоў прадпрыемстваў, бо такі кансерватызм перашкаджае далейшаму развіццю вытворчасці, асуджае прадпрыемствы на адсталасць і гібенне, падрывае абаронную магутнасць краіны.

11. Неабходна, далей, сістэматычна **зніжаць сабекошт выпускаемай прадукцыі,** усяляк умацоўваць гаспадарчы разлік, рашуча выкарчоўваць марнатраўства.

У мэтах правільнага кіраўніцтва работай прадпрыемства, неабходна ведаць фактычныя расходы на адзінку вырабу па асноўных элементах сабекошту — заработная плата, кошт сыравіны, паліва і электраэнергіі, амартызацыйныя налічэнні, адміністрацыйна-ўпраўленчыя расходы, і накіроўваць эканамічную старану дзейнасці прадпрыемства так, каб планы па сабекошту і па прыбытках безумоўна выконваліся.

12. Неабходна, далей, **у галіне заработнай платы строга і паслядоўна праводзіць прынцып матэрыяльнага заахвочвання добра працуючых,** ажыццяўляемы ў выглядзе здзельнай сістэмы аплаты для рабочых, прэміяльнай сістэмы для кіруючых работнікаў і ў выглядзе большай аплаты кваліфікаванай працы, параўнальна з некваліфікаванай.

Неабходна да канца ліквідаваць гнілую практыку ўраўнілаўкі ў галіне заработнай платы і дабіцца таго, каб здзельшчына і прэміяльная сістэма ў яшчэ большай меры сталі важнейшымі рычагамі ў справе павышэння прадукцыйнасці працы, а значыцца, і развіцця ўсёй нашай народнай гаспадаркі.

13. Неабходна, далей, **поўнасцю ліквідаваць прагулы.**

Праводзенне ў жыццё Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г. «Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў» значна палепшыла стан працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах. Аднак, прагулы і самавольныя ўходы на многіх фабрыках, заводах, рудніках, шахтах, чыгунках яшчэ далёка не спыніліся.

Партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, работнікі прамысловасці і транспарта абавязаны весці нястомную работу па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны ў прамысловасці і на транспарце, памятаючы аб тым, што задача барацьбы з цякучасцю рабочай сілы і прагуламі з'яўляецца не кароткатэрміновай кампаніяй, а патрабуе штодзённай работы ў масах.

14. Неабходна, далей, рашуча **ўмацаваць адзінаначалле на прадпрыемствах** і дабіцца таго, каб дырэктар прадпрыемства стаў на справе поўнаўладным кіраўніком, цалкам адказваючым за стан прадпрыемства і за парадак на вытворчасці.

15. Неабходна, далей, усямерна **ўмацаваць на прадпрыемствах тэхнічнае кіраўніцтва** вытворчасцю.

Неабходна накіраваць на прадпрыемствы, у цэхі, у шахты на падземныя работы частку інжынераў і тэхнікаў, працуючых у цэнтральных і мясцовых гаспадарчых установах і ў апаратах заводаўпраўленняў і шахтаўпраўленняў.

16. Неабходна на прадпрыемствах **падняць ролю майстра,** як непасрэднага арганізатара вытворчасці і паставіць справу такім чынам, каб майстар з'яўляўся поўнапраўным кіраўніком на даручаным яму ўчастку вытворчасці, поўнасцю адказваючы за захаванне тэхналагічнай дысцыпліны і за выкананне вытворчага задання па ўсіх паказальніках.

17. У адносінах маладых, канчаючых ВНУ, спецыялістаў неабходна ўстанавіць такі парадак, каб кожны, хто закончыў вышэйшую навучальную ўстанову, атрымліваў вытворчы вопыт на прадпрыемстве, праходзіў у абавязковым парадку стаж практычнай работы — памочніка майстра, майстра, інжынера ў цэху.

IV.

Арганізацыйныя задачы партарганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Якія меры трэба прыняць па лініі арганізацыйных задач партарганізацый, каб ліквідаваць недахопы ў рабоце прамысловасці і транспарта?

1. У мэтах узмацнення дапамогі наркаматам і прадпрыемствам прамысловасці і транспарта **неабходна мець у гарадах, абласцях, краях і рэспубліках з развітай прамысловасцю не аднаго, а некалькі сакратароў гаркомаў, абкомаў, крайкомаў, ЦК кампартый саюзных рэспублік па прамысловасці,** адпаведна асноўным галінам прамысловасці, якія ёсць у горадзе, вобласці, краі, рэспубліцы, а таксама там, дзе гэта патрэбна, сакратара па чыгуначнаму транспарту і сакратара па воднаму транспарту.

Сакратары па прамысловасці і транспарту абавязаны добра ведаць, што робіцца на прадпрыемствах, рэгулярна бываць на іх, павінны быць асабіста звязаны як з работнікамі прадпрыемстваў, так і з адпаведнымі наркаматамі, павінны дапамагаць ім у выкананні планаў і рашэнняў партыі па прамысловасці і транспарту, сістэматычна правяраць выкананне гэтых рашэнняў, ускрываць недахопы ў рабоце прадпрыемстваў і дабівацца ліквідацыі гэтых недахопаў.

2. Партыйныя арганізацыі абавязаны **вывучаць і добра ведаць кіруючых гаспадарчых і інжынерна-тэхнічных работнікаў прамысловых прадпрыемстваў і чыгунак.**

Неабходна смела вылучаць на кіруючыя пасады на заводах, фабрыках, чыгунках здольных і ініцыятыўных работнікаў, добрых арганізатараў, у асаблівасці з ліку інжынераў, знатакоў сваёй справы.

Неабходна вылучаць не толькі партыйных, але і непартыйных бальшавікоў, памятаючы, што сярод беспартыйных ёсць многа здольных і чэсных работнікаў, якія хоць і не састаяць у партыі і не маюць стажа, але працуюць часта лепш, больш добрасумленна, чым некаторыя камуністы са стажам.

Партыйныя арганізацыі абавязаны **своечасова ставіць пытанне аб замене нягодных і слабых работнікаў,** аб замене работнікаў бязвольных і няздольных кіраваць прадпрыемствам, чыгункай і наводзіць парадак на вытворчасці. **Балбатуноў, людзей няздольных на жывую справу, неабходна аслабаняць і ставіць на меншую работу, незалежна ад таго з'яўляюцца яны партыйнымі ці беспартыйнымі.**

3. Неабходна **пакончыць з адрывам палітаддзелаў чыгуначнага і воднага транспарта ад тэрытарыяльных партыйных арганізацый. Палітаддзелы павінны быць падсправаздачнымі абкомам, гаркомам партыі.**

Абкомы і гаркомы партыі абавязаны дабіцца ліквідацыі канцылярскіх метадаў у рабоце палітаддзелаў і ператварыць іх у баявыя органы партыі, балеючыя за работу транспарта і актыўна дапамагаючыя справе ўздыму транспарта.

4. Неабходна **аднавіць значэнне вытворча-гаспадарчых актываў на прадпрыемствах і ў наркаматах.**

У мэтах найлепшага скарыстання вопыту нізавых работнікаў, інжынераў, стаханаўцаў і разгортвання крытыкі і самакрытыкі, неабходна рэгулярна збіраць актывы ў наркамаце, главку, чыгунцы, заводзе, шахце. Актывы трэба збіраць як з прыцягненнем на іх работнікаў розных галін прамысловасці, так і па асобных галінах прамысловасці і транспарта.

5. Неабходна **ўсямерна развіваць стаханаўскі рух,** накіроўваючы ініцыятыву стаханаўцаў на павышэнне прадукцыйнасці працы, на вырашэнне важнейшых пытанняў вытворчасці, на падцягванне адстаючых участкаў вытворчасці.

6. Неабходна **пакончыць з няправільнай практыкай,** калі на радзе прадпрыемстваў партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія і іншыя грамадскія арганізацыі праводзяць у рабочы час сходы, пасяджэнні, нарады, дэзарганізуючы тым самым нармальную работу прадпрыемстваў.

Неабходна **безумоўна забараніць** партыйным, савецкім, прафсаюзным, камсамольскім і іншым грамадскім арганізацыям:

а) **скліканне** на прадпрыемствах і ва ўстановах **у рабочы час сходаў,** пасяджэнняў і ўсякага роду нарад;

б) **выклік у рабочы час** рабочых і служачых;

в) **зняцце** рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў **для пасылкі** іх на праводзенне бягучых кампаній або ў камандзіроўкі па шэфскіх і т. п. справах;

г) **адцягненне** ў рабочы час рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў ад іх непасрэднай работы для ўдзелу, па даручэнню грамадскіх арганізацый, у абследавальскіх камісіях і брыгадах.

Трэба **раз назаўсёды ўстанавіць, што рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў выконваюць даручэнні грамадскіх арганізацый толькі ў нерабочы час.**

***

Наша прамысловасць была і ёсць база развіцця ўсёй народнай гаспадаркі. Прамысловасць была і ёсць кіруючы пачатак ва ўсёй сістэме народнай гаспадаркі. Прамысловасць вядзе ўперад усю нашу сацыялістычную гаспадарку, уключаючы сельскую гаспадарку і транспарт. Прамысловасць была і ёсць база абароннай магутнасці краіны. У сучаснай міжнароднай абстаноўцы перад нашай прамысловасцю, перад усімі яе галінамі стаяць адказнейшыя задачы. Яна павінна працаваць выключна арганізавана, максімальна прадукцыйна. Пераабсталяваная на новай сучаснай тэхнічнай базе, забяспечаная ўласнымі крыніцамі ўсіх відаў прамысловай сыравіны, наша прамысловасць можа і павінна працаваць значна лепш і даваць прадукцыю па ўсіх галінах значна больш і больш высокай якасці чым зараз.

Гаспадарчыя і партыйныя кіраўнікі павінны павесці справу так, каб у 1941 годзе ні ў адной вобласці, ні ў адным горадзе і прамысловым цэнтры не асталося ні аднаго адстаючага прадпрыемства. У нашай прамысловасці і на транспарце не павінна быць адстаючых прадпрыемстваў. Усе заводы, фабрыкі, шахты, чыгункі абавязаны выконваць план.

Змагацца за выкананне плана, забяспечыць выкананне плана, працаваць па плану — гэта значыць:

а) выконваць гадавы, квартальны і месячны планы па выпрацоўцы прадукцыі не ў сярэднім, як гэта было да гэтага часу, а роўнамерна па плану, па загадзя распрацаванаму графіку вырабу гатовай прадукцыі;

б) выконваць план не толькі ў сярэднім па галіне прамысловасці, як гэта было да гэтага часу, а выконваць яго па кожнаму прадпрыемству ў паасобку;

в) выконваць план не толькі ў сярэднім па прадпрыемству, як гэта было да гэтага часу, але выконваць план штодзённа ў кожным цэху, у кожнай брыгадзе, на кожным станку і ў кожнай змене.

г) выконваць план не толькі па колькасных паказальніках, але абавязкова і якасна, камплектна, па асартыменту, з захаваннем устаноўленых стандартаў і па ўстаноўленаму планам сабекошту.

Вялікія поспехі дасягнуты нашай краінай у эканамічным і культурным будаўніцтве. Але нельга зазнавацца і супакойвацца на гэтых поспехах. Самая вялікая небяспека — спачыць на лаўрах і задаволіцца ўжо дасягнутым. Гэта было-б гібельным для нашай справы. У нас многа яшчэ буйных недахопаў. Цярпімасць да недахопаў у рабоце прамысловасці і транспарта надзвычайна небяспечна і шкодна.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) выражае ўпэўненасць у тым, што нашы партыйныя арганізацыі і ўсе кіруючыя работнікі прамысловасці і транспарта з усёй бальшавіцкай настойлівасцю возьмуцца за неадкладную ліквідацыю недахопаў у рабоце прамысловасці і транспарта, карэнным чынам палепшаць сваю работу ў гэтай галіне і, на аснове выканання рашэнняў XVIII канферэнцыі, мабілізуючы ўсю масу рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў вакол гэтых рашэнняў, даб'юцца ўжо ў бліжэйшы час новых, рашучых перамог сацыялістычнай прамысловасці і транспарта.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Гаспадарчыя вынікі 1940 года і план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1941 год

Даклад тав. Н. А. ВАЗНЕСЕНСКАГА

I. Вынікі 1940 года

Таварышы! 1940 год у жыцці Совецкага Саюза быў годам новага социялістычнага ўздыму і далейшага руху ўперад. Ні эканамічны крызіс у капіталістычных краінах, ні імперыялістычная вайна не спынілі і не маглі спыніць развіццё нашай народнай гаспадаркі.

Совецкая эканоміка не падвержана ўплыву ліхарадкі, якую перажывае капіталістычная гаспадарка кожны раз, асабліва пад ударамі крызісаў і войн. Тым не менш, урокі сучаснай імперыялістычнай вайны маюць некаторае значэнне і для нас.

Сучасная імперыялістычная вайна, калі разглядаць яе з тэхніка-эканамічнага боку, з'яўляецца вайной матораў. Маторы ў паветры, маторы на зямлі. Суадносіны сіл паміж двума групамі ваюючых капіталістычных краін у значнай ступені мяняюцца ў залежнасці ад вытворчасці матораў. Матор патрабуе высокай тэхнікі, многа нафты і каляровых металаў. Уся прамысловасць капіталістычных краін, у тым ліку Злучаных Штатаў Амерыкі, перабудоўваецца ў гэтым напрамку.

Сучасная імперыялістычная вайна з'яўляецца таксама ў значнай ступені вайной рэзерваў. Працягласць вайны, яе разбуральны характар, развал міжнароднага буржуазнага раздзялення працы — усё гэта патрабуе велізарных сыравінных, паліўных, металічных і вытворчых рэзерваў для ваюючай імперыялістычнай краіны.

Совецкі Саюз не можа не ўлічваць гэтых тэхніка-эканамічных, як і іншых асаблівасцей сучаснай вайны і прымае меры к таму, каб узбройваць сваю народную гаспадарку перадавой тэхнікай і наогул трымаць краіну ў стане належнай гатоўнасці.

Прывяду самыя агульныя паказальнікі росту ўзроўню вытворчасці Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік і Злучаных Штатаў Амерыкі за апошнія годы. Калі ўзровень 1929 года прыняць за 100, то дынаміка вытворчасці за апошнія тры годы выглядае наступным чынам:

Злучаныя Штаты Амерыкі

1929 год — 100 проц.
1938 год — 80 проц.
1939 год — 98 проц.
1940 год — 111 проц.

Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік

1929 год — 100 проц.
1938 год — 415 проц.
1939 год — 482 проц.
1940 год — 534 проц.

Толькі ў 1940 годзе на аснове ваеннай мабілізацыі прамысловасці Злучаныя Штаты Амерыкі павялічылі сваю вытворчасць у параўнанні з 1929 годам усяго на 11 процантаў. У той-жа час Совецкі Саюз за гэты час павялічыў сваю социялістычную вытворчасць у 5.3 раза.

Такія законамернасці капіталістычнага і социялістычнага ўзнаўлення. Пры гэтым у эканамічных адносінах, гэта значыць у вытворчасці на душу насельніцтва мы, як вядома, яшчэ адстаем ад Злучаных Штатаў Амерыкі, пры чым, па сталі, вугалю, па электраэнергіі мы адстаем у тры-чатыры разы. Ліквідаваць гэтае адставанне, гэта значыць вырашыць галоўную эканамічную задачу СССР, нам яшчэ прадстаіць.

Народная гаспадарка СССР развіваецца планамерна па законах расшыранага социялістычнага ўзнаўлення, што азначае, перш за ўсё, няўхільны рост вытворчасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Прадукцыя прамысловасці СССР вырасла за тры годы трэцяй пяцігодкі з 95.5 мільярда рублёў у 1937 годзе да 137.5 мільярда рублёў у 1940 годзе або на 44 проценты, у тым ліку прадукцыя машынабудаўніцтва вырасла на 76 процантаў.

У адносінах выпуску абароннай прадукцыі ўрад зыходзіў з простай ісціны: калі хочаш, каб ніякія «выпадковасці» не засталі наш народ знянацку — порах трымай сухім і не шкадуй сродкаў на вытворчасць самалётаў, танкаў, узбраення, ваенных караблёў і снарадаў.

Вытворчасць сродкаў вытворчасці ў прамысловасці ў 1940 годзе вырасла на 13,8 процанта супроць 1939 года і на 52 проценты супроць 1937 года. Вытворчасць сродкаў спажывання вырасла ў 1940 годзе на 7 процантаў супроць 1939 года і на 33 проценты супроць 1937 года. Рост вытворчасці суправаджаўся ў Совецкім Саюзе перабудовай прамысловасці, асабліва машынабудаўніцтва, для выпуску самай перадавой сучаснай тэхнікі, неабходнай народнай гаспадарцы і для абароны краіны.

Тым не менш, заданне трэцяй пяцігодкі па тэмпах росту прамысловай прадукцыі нямнога недавыканана. Замест 14 процантаў па пяцігадоваму плану, фактычныя сярэднегадовыя тэмпы росту прадукцыі за прайшоўшыя тры годы склалі каля 13 процантаў. Гэтае недавыкананне задання па тэмпах росту вытворчасці звязана перш за ўсё з адставаннем чорнай металургіі ў пачатку трэцяй пяцігодкі ад устаноўленага плана.

Чыгуначныя перавозкі за 1940 год выраслі з 392 мільярдаў тона-кіламетраў у 1939 годзе да 409 мільярдаў тона-кіламетраў у 1940 годзе. Рачныя перавозкі павялічыліся да 36 мільярдаў тона-кіламетраў супроць 34.6 мільярда тона-кіламетраў у 1939 годзе. Аднак, у рабоце чыгуначнага транспарта маюць месца сур'ёзныя дэфекты: праадаўжаюцца нерацыянальныя перавозкі, загружаючыя транспарт, не ліквідаваны вузкія месцы ў прапускной здольнасці раду вузлоў і напрамкаў.

Вырасла валавая прадукцыя зярна, цукровых буракоў, сланечніка, бульбы і гароднiны. Прадукцыя зернавых культур па СССР у 1940 годзе склала каля 7,3 мільярда пудоў.

Вырасла ў 1940 годзе пагалоўе жывёлы ў калгасах — буйнай рагатай жывёлы на 12 процантаў, свіней — на 15 процантаў, авечак—на 25 процантаў і коз—на 34 проценты. Грамадская калгасная жывёлагадоўля ўпэўнена павышае сваю долю ва ўсім пагалоўі жывёлы ў краіне.

Расшыранае социялістычнае ўзнаўленне азначае затым няўхільны рост социялістычнага накаплення, што перш за ўсё відаць з узроўню капітальных укладанняў.

Аб'ём капітальных укладанняў у народную гаспадарку СССР склаў у 1940 годзе амаль 38 мільярдаў рублёў (у тым ліку каля 6 мільярдаў рублёў па нецэнтралізаваных капітальных укладаннях).

За тры годы трэцяй пяцігодкі аб'ём капітальных укладанняў у народную гаспадарку СССР склаў 108 мільярдаў рублёў (у тым ліку 17,5 мільярда рублёў па нецэнтралізаваных капітальных укладаннях).

За тры годы трэцяй пяцігодкі ўступіла ў строй у дзяржаўнай прамысловасці (не лічачы раённай прамысловасці мясцовага значэння) да 2.900 фабрык, заводаў, шахт, электрастанцый і іншых прадпрыемстваў. Напомню, што за ўсю першую пяцігодку ў СССР было ўведзена ў дзеянне ўсяго 1.500 прамысловых прадпрыемстваў.

У рэзультаце ўводу ў дзеянне новых прадпрыемстваў за тры годы трэцяй пяцігодкі ўведзены ў дзеянне 51 мільён тон магутнасці па здабычы вугалю на новых шахтах, каля 2.400 тысяч кіловат магутнасцей на электрастанцыях, доменных печаў па выплаўцы чыгуну магутнасцю ў 2.900 тысяч тон, каля 1 мільёна бавоўнянапрадзільных верацён і іншыя вытворчыя магутнасці.

Аднак, план капітальных работ і ўводу ў дзеянне новых магутнасцей усё-ж недавыканан.

Расшыранае социялістычнае ўзнаўленне ў СССР азначае далей няўхільны рост матэрыяльнага ўзроўню працоўных, рост іх спажывання.

Абсалютны прырост народнага даходу за тры годы трэцяй пяцігодкі склаў у нязменных цэнах 29,5 мільярда рублёў, павялічыўшыся з 96 мільярдаў у 1937 годзе да 125,5 мільярда ў 1940 годзе.

Фонды заработнай платы ў народнай гаспадарцы СССР выраслі па галінах гаспадаркі, прадугледжаных у трэцяй пяцігодцы, з 82,2 мільярда рублёў у 1937 годзе да 123,7 мільярда рублёў у 1940 годзе, г. зн. у паўтара раза.

Грашовыя даходы калгасаў узраслі з 14,2 мільярда рублёў у 1937 годзе да 18,3 мільярда рублёў у 1939 годзе. Папярэднія даныя за 1940 год паказваюць далейшы значны рост грашовых і натуральных даходаў калгасаў у параўнанні з 1939 годам.

Рознічны тавараабарот у дзяржаўным і кааператыўным гандлі вырас з 125,9 мільярда рублёў у 1937 годзе да 174,5 мільярда рублёў у 1940 годзе.

Такім чынам, не гледзячы на ваенныя дзеянні, меўшыя месца на граніцах Совецкага Саюза ў 1939 годзе і пачатку 1940 года, народная гаспадарка СССР у прайшоўшым годзе зрабіла значны крок уперад у справе ажыццяўлення трэцяга пяцігадовага плана, упэўнена набіраючы тэмпы росту з месяца ў месяц.

З вынікаў 1940 года неабходна асабліва адзначыць пачатак сур'ёзнага росту выплаўкі метала і здабычы паліва.

У канцы 1940 года сярэднесутачная вытворчасць чыгуну вырасла да 46—47 тысяч тон супроць 40 тысяч тон у канцы 1937 года.

Выплаўка сталі павялічылася да 58—59 тысяч тон супроць 50—51 тысячы тон у канцы 1937 года.

Сутачная здабыча вугалю па Наркамату вугальнай прамысловасці паднялася к канцу 1940 года да 467 тысяч тон супроць 370 тысяч тон у канцы 1937 года.

Сярэднесутачная здабыча нафты і газа ў канцы 1940 года паднялася да 97—98 тысяч тон супроць 84—86 тысяч тон у канцы 1937 года.

Не гледзячы на гэты рост, нельга прызнаць дастатковым пачаўшыйся ўздым у металургіі і паліўнай прамысловасці. Павелічэнне вытворчасці метала адстае ад заданняў трэцяга пяцігадовага плана і яшчэ не забяспечвае растучых патрэбнасцей народнай гаспадаркі СССР. Не ўстранёна яшчэ адставанне нафтавай прамысловасці ад заданняў трэцяй пяцігодкі.

З вынікаў 1940 года неабходна таксама адзначыць падняцце працоўнай дысцыпліны і павелічэнне рабочага часу, затрачваемага рабочымі і служачымі на вытворчасць. Паляпшэнне работы прамысловасці і транспарта ў другой палавіне 1940 года ў значнай меры абавязана ўмацаванню працоўнай дысцыпліны і павелічэнню рабочага часу. Перш за ўсё, гэта сказалася ў такіх галінах здабываючай прамысловасці, як у руднай і вугальнай, што ў сваю чаргу забяспечыла вытворчы тыл для ўздыму металургіі і іншых галін народнай гаспадаркі.

Аднак, далёка не ўсе прадпрыемствы і наркаматы скарысталі магчымасці росту вытворчасці, якія створаны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР ад 26 чэрвеня 1940 года. Да ліку гэтых наркаматаў перш за ўсё адносіцца Наркамат лясной прамысловасці і Наркамат прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Прадпрыемствы гэтых прамысловых наркаматаў хоць некалькі і палепшылі сваю работу ў другой палавіне года, усё-ж за 1940 год значна недавыканалі план. Наркомы лясной прамысловасці і будаўнічых матэрыялаў павінны з гэтага факта зрабіць сур'ёзныя вывады.

У 1940 годзе падрыхтаваны прадпасылкі для паскарэння тэмпаў развіцця прамысловасці і ўсёй народнай гаспадаркі СССР у параўнанні з першымі годамі трэцяй пяцігодкі. Да гэтых прадпасылак перш за ўсё адносяцца:

а) пачаўшыйся ўздым у металургіі і паліўнай прамысловасці, які стварае моцную базу для росту ўсёй народнай гаспадаркі;

б) павелічэнне рабочага часу прыкладна на 15 процантаў у параўнанні з першымі гадамі трэцяй пяцігодкі і растучае ўмацаванне працоўнай дысцыпліны.

Самай жыццёвай і рашаючай прадпасылкай далейшага ўздыму з'яўляецца ўвага партыйных арганізацый у бок максімальных клопатаў аб патрэбах і інтарэсах прамысловасці і транспарта.

Такія асноўныя гаспадарчыя вынікі 1940 года.

II. Гаспадарчы план 1941 года

Задачы народнагаспадарчага плана 1941 года выцякаюць з рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі. Дзяржаўны план 1941 года, прыняты Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і Советам Народных Камісараў Саюза ССР, зыходзіць з наступных асноўных задач:

Па-першае, замацаваць самастойнасць і незалежнасць нашай народнай гаспадаркі ад капіталістычнага акружэння, не быць залежным ад капіталістычнай гаспадаркі, асабліва ў металургіі і машынабудаўніцтве.

Забеспячэнне незалежнасці народнай гаспадаркі СССР ад капіталістычнага акружэння з'яўляецца формай нашай барацьбы з капіталізмам. Імперыялістычная вайна, якая закрыла рынак у большасці капіталістычных краін, падкрэсліла гэтую задачу. У плане 1941 года яна вырашаецца шляхам фарсіраванага росту вытворчасці спецыяльных відаў машын, рэдкіх металаў, а таксама праграмай будаўніцтва новых прадпрыемстваў, асабліва ў галіне машынабудаўніцтва і металургіі.

Па-другое, план 1941 года зыходзіць з задач усямернага развіцця социялістычнай вытворчасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, што азначае новы крок уперад у справе завяршэння будаўніцтва бяскласавага социялістычнага грамадства ў СССР.

У плане 1941 года гэтая задача вырашаецца быстрымі тэмпамі ўздыму социялістычнай прамысловасці, асабліва яе вядучых галін, а таксама транспарта і сельскай гаспадаркі.

Па-трэцяе, план 1941 года зыходзіць з задачы не дапусціць дыспрапорцый у народнай гаспадарцы, а магчымасць прарыву перакрыць павелічэннем і стварэннем новых дзяржаўных рэзерваў.

Вядома, што прапорцыі ў народнай гаспадарцы СССР мяняюцца ў залежнасці ад задач, якія партыя і ўрад ставяць перад народнай гаспадаркай. Прымяняльна да плана 1941 года задача не дапусціць у народнай гаспадарцы дыспрапорцый — азначае даць больш высокія тэмпы росту металургіі і машынабудаўніцтву, а значыцца ўсёй групе, якая вырабляе сродкі вытворчасці. Асабліва неабходзен далейшы рост вытворчасці чыгуну, сталі, каляровых металаў, вугалю, нафты і максімальнае развіццё ўсіх відаў машынабудаўніцтва.

Прыняты Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і Советам Народных Камісараў СССР дзяржаўны план развіцця народнай гаспадаркі Саюза ССР на 1941 год прадугледжвае наступныя асноўныя гаспадарчыя задачы:

— давесці выпуск валавой прадукцыі прамысловасці СССР да 162 мільярдаў рублёў з ростам супроць узроўню 1940 года на 17—18 процантаў;

— павялічыць вытворчасць чыгуну да 18 мільёнаў тон, выплаўку сталі да 22.4 мільёна тон і вытворчасць пракату да 15,8 мільёна тон;

— забяспечыць здабычу вугалю ў размеры 191 мільёна тон, нафты з газам — 38 мільёнаў тон і торфу — 39 мільёнаў тон;

— забяспечыць рост прадукцыі машынабудаўніцтва супроць 1940 года на 26 процантаў;

— забяспечыць прырост магутнасцей электрастанцый на 1 мільён 750 тысяч кіловат;

— павялічыць магутнасць бавоўнянапапяровай прамысловасці на 850 тысяч прадзільных верацён;

— павялічыць валавую прадукцыю зернавых культур на 8 процантаў;

— забяспечыць сярэднесутачную пагрузку на чыгунках у размеры 103 тысяч вагонаў;

— павялічыць рознічны тавараабарот дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю да 197 мільярдаў рублёў;

— павялічыць прадукцыйнасць працы ў прамысловасці і будаўніцтве на 12 процантаў;

— знізіць сабекошт прамысловай прадукцыі на 3.7 процанта і забяспечыць за гэты кошт дадатковыя накапленні ў прамысловасці ў размеры 7,3 мільярда рублёў;

— выканаць праграму капітальных укладанняў у размеры 57 мільярдаў рублёў (у тым ліку 9 мільярдаў рублёў па нецэнтралізаваных капіталаўкладаннях);

— забяспечыць далейшае павелічэнне матэрыяльных і фінансавых дзяржаўных рэзерваў.

Такія асноўныя паказальнікі дзяржаўнага плана 1941 года.

Па асобных галінах народнай гаспадаркі план прадугледжвае наступныя задачы:

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

Рост вытворчасці сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання ў прамысловасці СССР відаць з наступных даных (у мільярдах рублёў):

	1940 г.	1941 г. (План)
Вытворчасць сродкаў вытворчасці павялічваецца	з 83,9 да	103,6 або на 23,5 проц.
Вытворчасць прадметаў спажывання павялічваецца . . .	з 53.6 да	58,4 або на 9 проц.

Такім чынам, рост вытворчасці прадметаў спажывання суправаджаецца яшчэ больш быстрым ростам вытворчасці сродкаў вытворчасці.

У гэтым апярэджваючым росце сродкаў вытворчасці відаць прагрэсіўны характар социялістычнага грамадства, рухаючага ўперад свае прадукцыйныя сілы.

Рост асобных відаў прадукцыі ў 1941 годзе ў адносінах да ўзроўню 1940 года складзе:

вугаль	116 проц.
нафта	111 »
электраэнергія	114 »
чыгун	121 »
сталь	122 »
якасны пракат	123 »
алюміній	166 »
медзь	131 »
нікель	199 »
малібдэн	428 »
паравозы	142 »
таварныя вагоны	194 »
станкі	128 »
цэмент	138 »
вывазка драўніны	136 »
папера	124 »
бавоўнянапапяровыя тканіны	111 »
абутак скураны	111 »
цукар пясок	127 »
кансервы	124 »

План 1941 года ў адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 10 ліпеня 1940 года патрабуе рашучага паляпшэння якасці прадукцыі. Ва ўсіх галінах прамысловасці стаяць новыя якасныя задачы па выпуску больш прадукцыйных машын, розных высокаякасных сартоў метала, новай перадавой тэхнікі.

Чорнай металургіі прадстаіць павялічыць супроць узроўню 1940 года выпуск спецыяльных легіраваных сталей на 100 процантаў, вытворчасць спецыяльнага ліста — на 85 процантаў і быстрарэжучай сталі — на 125 процантаў.

Каляровая металургія павінна забяспечыць высокую якасць каляровых і рэдкіх металаў, не ўступаючую стандартам перадавых у тэхнічных адносінах капіталістычных краін.

Гэта неабходна напомніць тым больш, што Наркамат каляровай металургіі яшчэ не зрабіў усіх урокаў з вядомага рашэння Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) у адносінах якасці прадукцыі прадпрыемстваў гэтага наркамата.

Машынабудаўніцтву прадстаіць забяспечыць масавую вытворчасць новай тэхнікі, высокапрадукцыйных станкоў, прэсаў. У прыватнасці, вытворчасць станкоў-аўтаматаў і паўаўтаматаў павялічваецца на 76 процантаў.

Прамысловасць СССР мае магчымасць не толькі выканаць, але і перавыканаць план 1941 года. Узровень вытворчасці, дасягнуты ў IV квартале 1940 года, стварае моцную базу для выканання і перавыканання праграмы 1941 года. У якасці прыкладу прывяду заданне па выплаўцы чыгуну і па выпуску таварных вагонаў.

Сярэднесутачная выплаўка чыгуну ў IV квартале 1940 года ўжо дасягнула амаль 95 процантаў сярэднесутачнай выплаўкі, прадугледжанай планам 1941 года. Такім чынам, супроць узроўню IV квартала 1940 года металургам для выканання гадавога плана трэба падняць выплаўку прыкладна на 6 процантаў. Ясна, што гэты план не толькі выканальны, але можа быць і перавыканан.

Або вазьміце вытворчасць таварных вагонаў. Сярэднесутачны фактычны выпуск вагонаў у IV квартале 1940 года ўжо склаў 90 процантаў ад прадугледжанага планам сярэднесутачнага выпуску вагонаў у 1941 годзе. Значыцца, вагонабудаўнікам, для выканання плана 1941 года, неабходна ў параўнанні з IV кварталам 1940 года падняць выпуск вагонаў прыкладна на 12 процантаў. Ясна, што і тут план не толькі выканальны, але можа быць і перавыканан.

Неабходна толькі мабілізаваць у прамысловасці нескарыстаныя магчымасці і рэзервы.

Па-першае, да такіх магчымасцей і рэзерваў адносіцца поўнае скарыстанне наяўнага абсталявання.

Вынікі перапісу станкоў і прэсаў, аб якім ужо часткова гаварыў тав. Маленкоў, сведчаць аб велізарным росце парка металарэжучых станкоў і кузнечна-прэсавага абсталявання ў прамысловасці СССР і вялікіх магчымасцях нашага машынабудаўніцтва.

Перапіс металаапрацоўчага абсталявання праводзіўся ў 1932 годзе і цяпер, у 1940 годзе. За гэты час агульная колькасць металарэжучых станкоў, якія ёсць у прамысловасці СССР, павялічылася ў 3,5 раза і кузнечна-прэсавага абсталявання ў 3 разы. Гэты рост азначае велізарнейшы вынік другой і трэцяй пяцігодак социялістычнага будаўніцтва і ў развіцці прамысловасці і асабліва машынабудаўніцтва.

Аднак, тыя-ж вынікі перапісу паказваюць, што металарэжучыя станкі і кузнечна-прэсавае абсталяванне ў нас скарыстоўваюцца вельмі незадавальняюча. Перапіс выявіў на прадпрыемствах і будоўлях не ўстаноўленых на 1 лістапада 1940 года каля 46 тысяч станкоў і 8 тысяч адзінак кузнечна-прэсавага абсталявання.

Апрача таго, 70 тысяч станкоў і 15 тысяч адзінак кузнечна-прэсавага абсталявання ў дзень перапісу 1 лістапада 1940 года не працавалі. Станкі і прэсы прастайвалі як з-за рамонту, так і па розных унутрызаводскіх прычынах, нясвоечасовая дастаўка інструмента, матэрыялаў, фабрыкатаў, недахоп рабочых.

Калі з агульнага ліку не ўстаноўленых і не працаваўшых металарэжучых станкоў выключыць тыя, якія знаходзіліся ў мантажы і ў рамонце, а таксама станкі, якія прадпрыемствамі лічацца нягоднымі, то і ў гэтым выпадку заставалася звыш 30 тысяч не ўстаноўленых, а з ліку ўстаноўленых 38 тысяч не працаваўшых станкоў, што ў агульнай складанасці састаўляе 68 тысяч. Наколькі значны гэты рэзерв совецкага машынабудаўніцтва, відаць з таго, што ЗША выпускалі ў лепшы для іх 1929 год каля 65 тысяч станкоў.

Па-другое, да магчымасцей і рэзерваў росту прамысловасці неабходна аднесці павышэнне тэхнікі вытворчасці, прымяненне больш дасканалых машын і ўкараненне перадавой тэхналогіі. Дазвольце прывесці некалькі прыкладаў на гэтую тэму.

Першы прыклад—аўтаматызацыя тэхналагічнага працэса ў ліцейнай справе. Сутнасць працэса заключаецца ў наступным. Звычайна выраб фармуецца ў земляных формах, у опоках. Пры аўтаматызацыі ліцейнай справы, як гэта, напрыклад, мае месца на Клімаўскім машынабудаўнічым заводзе, фармоўка вырабаў у земляныя формы не робіцца. Замест гэтага ажыццяўляецца заліўка метала ў пастаянныя металічныя формы, устаноўленыя на спецыяльнай ліцейнай машыне карусельнага тыпу, якая складаецца з 12 секцый. Гэта машына дазваляе рабіць адліўку вырабаў бесперапынна і даваць у дзень пры двухзменнай рабоце 10 тысяч адлівак або 3 мільёны ў год.

Бесперапынная адліўка ў пастаянныя формы на машыне карусельнага тыпу, у спалучэнні з механізацыяй іншых аперацый і прымяненнем высокапрадукцыйных аўтаматаў для механічнай апрацоўкі вырабаў пасля адліўкі, дазволіць скараціць вытворчыя плошчы, занятыя ліццём, у 6 раз, скараціць колькасць рабочых сярэдняга разрада больш чым у 2.5 раза, знізіць брак ліцця ўдвая, скараціць колькасць металарэжучага і дапаможнага абсталявання ў чатыры разы, знізіць сабекошт вырабаў удвая і пры гэтым атрымаць чыгуннае ліццё, па якасці амаль не ўступаючае бессемераўскай сталі.

Гэты метад атрымання ліцця ў пастаянных формах неабходна шырока распаўсюдзіць у машынабудаўніцтве. Аўтаматызацыя вытворчасці стварае магчымасць рэзкага павелічэння ліцця на існуючых вытворчых плошчах і зніжэння сабекошту вырабаў.

Другі прыклад—замена коўкі дэталяў штампоўкай. Сутнасць гэтай замены заключаецца ў наступным. Пры коўцы дэталь абціскаецца паміж двума плоскімі байкамі молата або прэса і паступовымі ўдарамі пры непасрэдным удзеле каваля прымае грубую форму — з наступаючай даволі значнай механічнай апрацоўкай на станку. Пры штампоўцы нагрэты метал ударамі магутнага молата (прэса) заганяецца ў фасонную поласць штампа (форму) з наступаючай нязначнай апрацоўкай на станку для абрэзкі лішку. У выніку змяншаюцца прыпускі на механічную апрацоўку, у радзе выпадкаў атрымліваецца зусім чыстая паверхня, скарачаецца час на апрацоўку і расход метала на выраб. Прывяду прыклад з вырабам дэталі № 24 на Молатаўскім машынабудаўнічым заводзе:

	Пры коўцы	Пры штампоўцы
Час вырабу дэталі	100 мінут	7 мінут
Адыходы і стружка ў процантах да чыстай вагі дэталі.	120—130	40—50

Неабходна адзначыць, што штампоўка патрабуе, вядома, больш магутнага і дакладнага абсталявання і вырабу штампаў. Штампоўка можа быць прыменена на ўсіх машынабудаўнічых заводах з серыйнай і масавай вытворчасцю.

Трэці прыклад — аўтаматычная зварка голым электродам па метаду інстытута электразваркі Украінскай Акадэміі навук. Сутнасць метада заключаецца ў наступным. Працэс зваркі голым электродам робіцца пад тоўстым пластом флюса. Пад аховай гэтага пласта адбываецца канцэнтрыраваны нагрэў метала і больш быстрае яго плаўленне. Будучы ахаваны пластом флюса, расплаўлены метал, а значыцца і зварны шоў, не змяшчае шкодных прымясей і набывае павышаныя механічныя ўласцівасці. За кошт больш быстрага працэса награвання метала, аўтаматычнай падачы флюса і электрода, аўтаматычнага перамяшчэння зварваючага механізма ствараецца велізарная эфектыўнасць. Прадукцыйнасць працы ўзрастае ў 5—10 раз, скарачаюцца затраты працы і матэрыялаў.

Шырокае прымяненне метада аўтаматычнай зваркі магчыма і неабходна на многіх заводах машынабудаўніцтва, у суднабудаўніцтве і будаўніцтве.

Чацверты прыклад—станкі з прыборамі аўтаматычнага кантролю. Сутнасць гэтага кантролю заключаецца ў наступным. Кантрольныя апераціі над вырабляемай дэталлю, ужываемыя ў звычайнай практыцы, не забяспечваюць неабходнай дакладнасці, змяншаюць прадукцыйнасць станка, бо кантрольныя аперацыі звязаны са зняццем дэталі са станка, спыненнем яго і, значыць, са стратай часу. Пры аўтаматычным кантролі да станка-аўтамата прымацоўваецца прыбор, дазваляючы незалежна ад рабочага, без зняцця дэталі і спынення станка аўтаматычна правяраць якасць і гатоўнасць дэталі. Метад аўтаматычнага кантролю забяспечвае дакладнасць у вытворчасці і рэзка змяншае брак, скарачае прастоі станка на 20—30 проц. і стварае магчымасць абслугоўвання адным рабочым 3—4 станкоў замест аднаго. Хаця галіна прымянення аўтаматычнага кантролю вельмі шырокая,—справа гэта на нашых заводах развіта вельмі слаба.

Такім чынам, прымяненне перадавой тэхнікі і тэхналогіі стварае вялікія дадатковыя магчымасці росту вытворчасці.

Па-трэцяе, да магчымасцей і рэзерваў далейшага роста вытворчасці адносіцца зніжэнне сабекошту і шматлікіх непрадукцыйных выдаткаў.

Прыбытковасць социялістычнай прамысловасці расце з года ў год. Чысты прыбытак прадпрыемстваў прамысловых наркаматаў СССР склаў у 1938 годзе 5,2 мільярда рублёў, у 1939 годзе—8,5 мільярда рублёў, а ў 1940 годзе прыбытак склаў ужо каля 14 мільярдаў рублёў. Вядома, што закон капіталістычнага прыбытку не пануе ў совецкай прамысловасці. Палітыка партыі ў адносінах развіцця тых або іншых галін прамысловасці вызначаецца не размерамі іх прыбытку, а інтарэсамі перамогі социялізма і захавання незалежнасці СССР ад капіталістычнага свету. Інакш у нас развівалася-б хутчэй усіх, напрыклад, мукамольная або водачная прамысловасць, як больш прыбытковыя, а не цяжкая прамысловасць.

Тым не менш, ліквідацыя ўбыткаў у прамысловасці і скарачэнне сабекошту з'яўляецца нашай першачарговай задачай, бо гэта аздаровіць прадпрыемствы, палепшыць іх абаротныя сродкі, дапаможа паскарэнню тэмпаў вытворчасці. Нельга таму прызнаць нармальным захаванне ўбыткаў у некаторых важнейшых галінах прамысловасці. Напрыклад, у лясной прамысловасці ў 1940 годзе, дзе на кожны кубаметр драўніны атрыман убытак у 11—12 рублёў, і ў сланцавай прамысловасці, дзе на кожную тону здабытых сланцаў у 1940 годзе атрыман убытак у 33 рублі.

Магчымасці скарачэння выдаткаў вытворчасці і сабекошту ў нас валяюцца, літаральна на кожным кроку. Вазьміце размеры браку. Рад прадпрыемстваў яўна не спраўляецца з задачай выпуску добраякаснай прадукцыі. Страты ад браку на прадпрыемствах машынабудаўнічых наркаматаў і Наркамата чорнай металургіі ў 1940 годзе склалі каля 2 мільярдаў рублёў. Скарачэнне гэтага брака напалавіну азначала-б чысты дадатковы прырост прадукцыі ў мільярд рублёў.

Сур'ёзнай крыніцай зніжэння выдаткаў вытворчасці з'яўляецца скарачэнне непрадукцыйных адміністрацыйна-ўпраўленчых расходаў. Гэтыя расходы вельмі вялікія. Колькасць служачых на прадпрыемствах у адносінах да рабочых вельмі раздута.

У 1937 годзе ў прамысловасці саюзных і рэспубліканскіх наркаматаў у сярэднім на 1000 рабочых прыходзілася 75 служачых, у 1939 годзе—90 служачых і ў 1940 годзе—87 служачых. Як бачыце, у 1940 годзе колькасць служачых на 1.000 рабочых некалькі скарацілася, але ўсё-ж яна значна вышэй 1937 года. Мы можам і павінны знізіць удзельную вагу служачых па крайняй меры да ўзроўню 1937 года, што і прадугледжваецца планам 1941 года. Гэта дасць дадатковыя працоўныя рэзервы для вытворчасці і скараціць непрадукцыйныя выдаткі вытворчасці.

Каб скарыстаць усе гэтыя і іншыя магчымасці росту прамысловасці, трэба развіць сістэму матэрыяльнага заахвочвання работнікаў, добра і эканомна выконваючых план, а для гэтага — да канца ліквідаваць ураўнілаўку і несправядлівасць у аплаце працы на вытворчасці.

Несправядлівасць і ўраўнілаўка захаваліся на вытворчасці паміж дапаможнымі і асноўнымі вытворчымі рабочымі: як правіла, дапаможныя рабочыя маюць больш ільготныя нормы выпрацоўкі, а выкананне іх кантралюецца недастаткова.

Несправядлівасць існуе і ў аплаце працы гаспадарчых кіраўнікоў і інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў: кіраўнікі, выконваючыя план, і гора-кіраўнікі, зрываючыя план, аплачваюцца аднолькава. Ліквідацыя гэтай несправядлівасці, правільная практыка матэрыяльнага заахвочвання работнікаў разбудзіць новыя магчымасці росту нашай прамысловасці.

Такія задачы плана 1941 года ў галіне прамысловасці.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Пераходжу да пытанняў сельскай гаспадаркі. 1940 год для сельскай гаспадаркі быў годам далейшага ўмацавання калгаснага ладу і ўздыму сельскай гаспадаркі. Найбольш важнымі мерапрыемствамі партыі і ўрада, накіраванымі на ўмацаванне калгаснага ладу, за апошні год трэба лічыць:

Па-першае, меры па ахове грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання. Гэтыя меры падсеклі тэндэнцыю развязвання прыватна-ўласніцкіх адносін у вёсцы, аб чым таварыш Сталін у свой час папярэдзіў партыю;

Па-другое, пераход да вылічэння пастаўкі прадуктаў паляводства і жывёлагадоўлі з гектара зямельнай плошчы. Гэтае рашэнне развязала ініцыятыву калгаснікаў у справе быстрага росту грамадскай гаспадаркі, асабліва грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах;

Па-трэцяе, рашэнне Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў СССР па Украіне аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

Гэтыя рашэнні і мерапрыемствы з'яўляюцца гістарычнымі для развіцця і замацавання перамогі социялізма ў вёсцы. На іх аснове расце і ўмацоўваецца социялістычная сельская гаспадарка. Паднялося таксама значэнне і роля планіравання сельскай гаспадаркі. Паказальнікі плана ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур

(Працяг даклада тав. Н. А. Вазнесенскага на 3 стар.).

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Гаспадарчыя вынікі 1940 года і план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1941 год

Даклад тав. Н. А. ВАЗНЕСЕНСКАГА

і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі набываюць цяпер большую значымасць у сувязі з дадатковай аплатай працы калгаснікаў, перавыконваючых гэтыя паказальнікі. Тым самым, план у сельскай гаспадарцы атрымаў дадатковую велізарную сілу.

На 1941 год **рост пасеўных плошчаў** па асноўных сельскагаспадарчых культурах прадугледжваецца ў наступных размерах:

Усе пасеўныя плошчы складуць	157	млн. га або	103,9%	да 1940 года
у тым ліку: зернавыя	111,1	»	100,2	»
тэхнічныя	12,0	»	101,7	»
гароднінна-бахчавыя і бульба	11,4	»	112,9	»
кармавыя	22,5	»	124,3	»

З прыведзеных даных відаць наступнае:

1. Пасеўныя плошчы ў сярэднім па ўсіх культурах растуць амаль на 4 процанты.
2. Асабліва быстра яны растуць па кармавых і гароднінна-бахчавых культурах.
3. Зернавыя культуры амаль захоўваюцца на ўзроўні 1940 года.

Змяненне структуры пасеўных плошчаў звязана галоўным чынам з пераходам да правільнага севаабароту і са значным пашырэннем плошчаў пад кармавымі культурамі.

Валавая прадукцыя зернавых і тэхнічных культур па СССР таксама значна расце. Валавая прадукцыя зярна павялічылася ў 1940 годзе на 7.3 процанта, прадукцыя цукровых буракоў вырасла на 18.6 процанта, сланечніка—на 13.2 процанта і бульбы — на 35.6 процанта.

Не гледзячы на неспрыяючыя ўмовы надвор'я 1939—40 года (выключна моцныя маразы, запяжная вясна, засушлівае надвор'е на ўсходзе), размер валавой прадукцыі зярна і тэхнічных культур у 1940 годзе намнога вышэй ураджаю спрыяючага для сельскай гаспадаркі 1913 года і паследуючых год. Прадукцыя бавоўны і ільну, хоць значна перавысіла ў 1940 годзе ўзровень 1913 года (па бавоўне ў 3.4 раза, а па ільну ў 1,5 раза), усё-ж адстае ад планавых заданняў, што патрабуе да сябе ўвагі органаў Наркамзема і мясцовых партыйных арганізацый

Планам 1941 года прадугледжваецца далейшы рост валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі: зернавой прадукцыі, бавоўнасырцу, ільна-валакна, цукровых буракоў, бульбы і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі. Валавая прадукцыя зернавых культур, пераважна за кошт росту ураджайнасці, павінна скласці ў 1941 годзе каля 7 мільярдаў 900 мільёнаў пудоў.

Пры гэтым надзвычай важна адзначыць рост зернавой прадукцыі ў паўднёва-ўсходніх і ўсходніх раёнах СССР. У Паволжы ў 1940 годзе атрыман ураджай зернавых культур у колькасці 937 мільёнаў пудоў, што перавышае амаль на 32 процанты ўзровень 1913 года, які лічыўся ў Расіі годам самага высокага ураджаю.

У агульным зборы зернавых культур па СССР значна ўзрасла ўдзельная вага ўсходніх раёнаў. Вытворчасць зернавой прадукцыі ва ўсходніх раёнах Савецкага Саюза ў 1940 годзе, не гледзячы на засушлівае надвор'е, склала 1.482 мільёны пудоў і перавысіла ўзровень 1913 года на 88 процантаў. Такім чынам, на паўднёвым усходзе і ўсходзе нашай радзімы створана моцная жытніца народаў Савецкага Саюза.

Вырасла колькасць машын, прымяняемых у сельскай гаспадарцы Савецкага Саюза. У 1940 годзе колькасць трактараў павялічылася да 523 тысяч супроць 483 тысяч у 1938 годзе, колькасць камбайнаў — да 182 тысяч супроць 153 тысяч у 1938 годзе і мноства іншых складаных і простых машын. На аснове гэтай тэхнікі соцыялістычнага земляробства ўздым вытворчасці ў сельскай гаспадарцы стаў устойлівым.

На аснове мерапрыемстваў, праведзеных ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі, устаноўленні мінімума пагалоўя жывёлы ў калгасах і пераходзе да вылічэння мясапаставак з гектара зямельнай плошчы, калгасы маюць буйныя поспехі ў справе арганізацыі жывёлагадоўчых ферм, роста пагалоўя жывёлы і павышэння прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

За тры годы трэцяй пяцігодкі колькасць ферм прадуктыўнай жывёлы павялічылася ў калгасах у наступных размерах:

	на 1. 1. 1938 г.		на 1. 1. 1941 г.	
Усяго ферм павялічылася	з 347 тысяч	да 618 тысяч	або на 78 процантаў.	
У тым ліку:				
буйнай рагатай жывёлы	132 »	» 234 »	» 77 »	
аўцагадоўчых	71 »	» 216 »	» 205 »	
свінагадоўчых	77 »	» 168 »	» 117 »	

К пачатку 1941 года на 100 калгасаў у сярэднім прыпадае 261 ферма, у тым ліку 99 ферм буйнай рагатай жывёлы, 91 аўцагадоўчая ферма і 71 свінагадоўчая ферма.

Пагалоўе рабочай і прадуктыўнай жывёлы ў калгасных фермах за гэты час вырасла да наступных размераў:

буйнай рагатай жывёлы	да 20	мільёнаў галоў
авечак і коз	» 41,9	»
свіней	» 8,2	»
коней	» 14.4	»

Колькасць буйнай рагатай жывёлы ў калгасных фермах к канцу 1940 года дасягнула ўзроўню пагалоўя, якое мела ўся Германія ў 1938 годзе. А Германія па праву лічыцца краінай развітай жывёлагадоўлі.

План 1941 года прадугледжвае ў адпаведнасці з жаданнем саміх калгасаў далейшы рост калгаснай жывёлагадоўлі, а іменна: буйнай рагатай жывёлы на 19 проц., у тым ліку кароў на 24—25 проц., авечак і коз на 23—24 проц., свіней на 38 процантаў і коней на 9—10 процантаў.

Поспехі сельскай гаспадаркі СССР вялікія. Аднак, яны могуць быць яшчэ большымі, калі мы мабілізуем дадатковыя магчымасці ліквідуем недахопы і цярпімасць да іх з боку органаў Наркамата земляробства і Наркамата соўгасаў. Да гэтых недахопаў трэба аднесці, па крайняй меры, наступныя:

1. Прастоі трактараў і камбайнаў нават у гарачы перыяд сельскагаспадарчых работ.
2. Страты ўраджаю зернавых і тэхнічных культур, асабліва з-за нясвоечасовай уборкі.
3. Некалькі перапавялічаныя страты ў жывёлагадоўлі і невыкананне заданняў па прадуктыўнасці жывёлы.
4. Наяўнасць часткі калгаснікаў, не выконваючых неабходнага мінімума працадзён, што затрымлівае скрытыя працоўныя рэзервы ў сельскай гаспадарцы.

Пераход па прыкладу Украіны да сістэмы дадатковай аплаты працы калгаснікаў, атрымаўшых больш высокую, у параўнанні з планам, ураджайнасць сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі, яшчэ больш узніме калгаснае сялянства на барацьбу за далейшы росквіт соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Такія асноўныя задачы плана 1941 года ў галіне сельскай гаспадаркі.

ТРАНСПАРТ

Пераходжу да пытанняў транспарта. Рост прадукцыі народнай гаспадаркі ў краіне з кожным годам сradз'яўляе дадатковыя патрабаванні да чыгуначнага і воднага транспарта ў адносінах перавозак велізарнай масы грузаў. Павялічваецца патрэбнасць транспарта ў тэхнічным узбраенні. Разам з ростам грузаабароту ў краіне павышаецца таксама патрэбнасць у рацыянальнай арганізацыі грузапатокаў.

Сучасная вайна паказвае велізарнае значэнне транспарта ў жыцці краін і народаў. Ні адна марская дзяржава, калі яна хоча быць самастойнай, не можа абыйсціся без высока развітага марского флота і марскіх шляхоў зносін. Але СССР—не толькі марская дзяржава. Наша краіна, што яшчэ больш важна, з'яўляецца буйнейшай чыгуначнай дзяржавай. Значэнне чыгуначнага транспарта ў СССР такое-ж вялікае, як і значэнне марскога флота для буйнай марской дзяржавы.

На працягу прайшоўшых год Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў СССР праяўлялі асобыя клопаты аб патрэбах транспарта і ўсямерна ўмацоўвалі яго. Ваенныя дзеянні ў канцы 1939 і пачатку 1940 года, якія прышлося несці Чырвонай Арміі, паказалі, што чыгуначны транспарт, не гледзячы на асобныя недахопы, справіўся і безумоўна можа спраўляцца з мабілізацыйнымі патрэбнасцямі нашай Чырвонай Арміі.

У 1941 годзе перавозкі растуць у наступных размерах:

Грузаабарот чыгуначнага транспарта павялічваецца	да 431 мільярда тона-кіламетраў	або на 4 проц.
Грузаабарот рачного транспарта »	46.3 »	або 28 проц.

Як бачыце, план 1941 года зыходзіць з задачы значна больш быстрага росту рачных перавозак з мэтай разгрузкі чыгуначнага транспарта і забеспячэння воднымі перавозкамі быстра павялічваючыхся масавых грузаў. У сувязі з будаўніцтвам і развіццём водных шляхоў—Днепра-Бугскага канала, канала Масква—Волга, рэканструкцыяй Марыінскай воднай сістэмы — рачны транспарт мае поўную магчымасць выканаць гэта заданне.

Буйнейшай крыніцай павелічэння перавозак грузаў у неабходных народнай гаспадарцы размерах і напрамках з'яўляецца **ліквідацыя нерацыянальных, гэта значыць празмерна далёкіх і сустрэчных перавозак.** Скарачэнне часу прабегу грузаў зніжае выдаткі вытворчасці тавараў, змяншае час, які ідзе на іх вытворчасць, і, значыцца, паскарае тэмпы расшыранага соцыялістычнага ўзнаўлення.

Між тым, у нас у значных размерах захаваліся сустрэчныя і празмерна дальнія перавозкі. Хоць у цэлым па ўсіх грузах дальнасць прабега ў 1940 годзе нямнога скарацілася супроць 1939 года, — усё-ж дальнасць перавозак такіх масавых грузаў, як каменны вугаль і лес, у 1940 годзе не толькі не зменшылася, але нават павялічылася. Прывяду некалькі прыкладаў нерацыянальных перавозак, меўшых месца ў 1940 годзе.

У Сярэднюю Азію — у раёны Ташкенцкай і Ашхабадскай чыгунак было завезена з Сібіры 470 тысяч тон кузнецкага вугалю. Між тым, патрэбнасць саюзных рэспублік Сярэдняй Азіі, у тым ліку патрэбнасць самога чыгуначнага транспарта, з лішкам можа пакрывацца за кошт здабычы мясцовых вугаляў, запасы якіх вельмі вялікія.

Перавозкі з Сібіры кузнецкага вугалю ажыццяўляліся ў 1940 годзе нават у раёны Куйбышэўскай, Казанскай, Горкаўскай дарог і далей на захад — у колькасці 2,5 мільёна тон, хоць запасы вугалю, сланцаў, торфа на Урале і ў цэнтральных раёнах Савецкага Саюза таксама дастаткова вялікія.

Нерацыянальныя або празмерна дальнія перавозкі вугалю, калі львіная доля перавозімага вугалю затрачваецца на топку паравоза, які вязе гэты вугаль, павінны быць ліквідаваны. Неабходна для гэтага павялічыць здабычу вугалю ў цэнтральных раёнах, на Урале і ў Сярэдняй Азіі. Неабходна для гэтага, каб Наркамат шляхоў зносін і Дзяржплан па-сапраўднаму кантраліравалі ход перавозак.

З прычыны адставання Наркамата чорнай металургіі ў правядзенні мер па ліквідацыі складаўшайся вузкай спецыялізацыі пракатных станаў і дэфектаў у арганізацыі снабжэння металам, да гэтага часу ажыццяўляюцца сустрэчныя перавозкі метала паміж раёнамі. З раёнаў УССР было вывезена ў 1940 годзе 12.5 мільёна тон і завезена 900 тысяч тон метала. З раёнаў Урала вывезена 2 мільёны тон, а завезена 1,4 мільёна тон метала. З раёнаў цэнтра вывезена 1,8 мільёна тон і адначасова завезена 3,5 мільёна тон метала. З раёнаў паўночнага захада вывезена 800 тысяч тон і адначасова завезена 2 мільёны тон метала. Такім чынам, адны і тыя-ж раёны, адгружаючы вялікія колькасці метала, разам з тым завозяць іх у адваротным напрамку з іншых раёнаў.

З прычыны невыканання Наркаматам чорнай металургіі рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) аб новых раёнах здабычы марганцавай руды, для патрэб Урала і Сібіры прадаўжаецца яе завоз з аддаленых раёнаў Закаўказзя і Украіны. З Чыатур і Нікопаля на Урал было адпраўлена ў 1940 годзе 185 тысяч тон і ў раёны Сібіры—90 тысяч тон марганцавай руды. У той-жа час багатыя месцараджэнні марганцавых руд на Паўночным Урале і ў Башкірыі Наркаматам чорнай металургіі прадаўжаюць слаба распрацоўвацца.

Такім чынам, дадатковыя магчымасці паляпшэння работы чыгуначнага транспарта, звязаныя з ліквідацыяй нерацыянальных перавозак, далёка не скарыстаны. Між тым, памяншэнне сярэдняй дальнасці перавозак, а значыцца дальнасці прабегу вагонаў, хоць-бы на 10 кіламетраў супроць фактычнай дальнасці прабегу ў 1940 годзе, дасць магчымасць павялічыць чыгункам пагрузку новых грузаў амаль на 1.5 тысячы вагонаў у суткі.

У 1941 годзе чыгуначны транспарт атрымлівае ад дзяржавы капіталаўкладанні ў аб'ёме 6.500 мільёнаў рублёў, што перавышае ўзровень 1940 года амаль на 55 процантаў. Колькасць вагонаў, пастаўляемых у 1941 годзе чыгуначнаму транспарту, амаль падвойваецца.

Перад чыгункамі перш за ўсё стаіць задача прывесці ў поўны парадак існуючыя асноўныя фонды-пуці, рухомы састаў, расшыць вузкія чыгуначныя напрамкі і вузлы, якія зніжаюць эфектыўнасць работы ўсёй чыгуначнай сеці краіны.

Апрача некаторых спецыяльных напрамкаў і вузлоў, якія Наркамату шляхоў зносін прадстаіць у 1941 годзе ўзмоцніць, неабходна звярнуць таксама ўвагу на ўзмацненне прапускной здольнасці Уральскіх чыгунак, якія да гэтага часу адстаюць у выкананні планавых заданняў. Гэтае адставанне павінна быць поўнасцю ліквідавана, бо значэнне чыгунак Урала для народнай гаспадаркі СССР вельмі вялікае.

Вялікія магчымасці чыгуначнага транспарта закладзены **ў паскарэнні абароту рухомага састава.** Аб вялікіх рэзервах чыгуначнага транспарта сведчаць наступныя факты. Калі час абароту вагона ў 1940 г. прыняць за 100, то

вагон знаходзіўся ў руху	19 проц.	ад усяго часу абароту
на прамежкавых станцыях	11 проц.	» »
пад пагрузкай і выгрузкай	21 проц.	» »
пад тэхнічнай перапрацоўкай і іншымі аперацыямі	49 проц.	» »

За 1940 год час абароту вагона на некалькі гадзін скараціўся ў параўнанні з 1939 годам. Аднак, тут ёсць яшчэ вельмі вялікія магчымасці. Змяншэнне абароту вагона за кошт скарачэння прастою пад пагрузкай і выгрузкай, а таксама тэхнічнай перапрацоўкай на 3—4 проц. ствараe магчымасць павелічэння пагрузкі новых грузаў на чыгунках прыкладна на 3,5 тысячы вагонаў у суткі.

Але яшчэ большыя магчымасці ёсць у народнай гаспадаркі для росту грузаабароту—па лініі **воднага транспарта.** СССР багацейшая краіна па сваіх вялікіх водных магістралях.

Перавозкі па вадзе хоць і выраслі ў 1940 годзе, усё яшчэ адстаюць ад планавых заданняў і недастаткова аблягчаюць работу чыгуначнага транспарта.

Асабліва неблагапалучна абстаіць справа на рачным транспарце з перавозкай такіх грузаў, як лес, будаўнічыя матэрыялы, вугаль і нафта. Прывяду некалькі прыкладаў.

У Ленінград і Ленінградскую вобласць штогод паступае па чыгуначнаму транспарту 1,5 мільёна тон лесу. Між тым Наркамат рачнога флота мае поўную магчымасць арганізаваць дастаўку гэтага леса водным транспартам па Беламорска-Балтыйскаму каналу і Марыінскай воднай сістэме. Гэтага патрабуюць інтарэсы народнай гаспадаркі і чыгуначнага транспарта.

У 1940 годзе на Орджанікідзеўскую і Закаўказскую дарогі было завезена чыгуначным транспартам каля 1,2 мільёна тон лесу. Гэтыя перавозкі маглі быць цалкам пераключаны на водны транспарт. Між тым завоз лесу па Волзе і Каспійскаму мору ў раёны Орджанікідзеўскага краю і Закаўказзя Наркаматам рачнога флота арганізаван крайне нездавальняюча.

Да гэтага часу недастаткова скарыстоўваецца рачны транспарт для разгрузкі чыгунак ад перавозак нафты. План нафтаперавозак за 1940 год не быў выканан, у прыватнасці не выканан ён па вывазу нафты з Астрахані ўверх па Волзе. У 1941 годзе Наркамату рачнога флота прадстаіць значнае павелічэнне перавозак нафты вадой

Даныя аб скарыстанні рачнога флота сведчаць аб наяўнасці вялікіх нескарыстаных магчымасцей для павелічэння водных перавозак.

У выніку нясвоечасовага выпаду суднаў з зімовага суднарамонту ў 1940 годзе Наркамат рачнога флота толькі па буксірнай цязе недавыканаў заданне амаль на 1,3 мільярда тона-кіламетраў, у прыватнасці па буйнейшаму Волжскаму нафтаналіўному параходству гэтае недавыкананне склала 750 мільёнаў тона-кіламетраў.

Апрача таго, у выніку затрымкі суднаў у летнім рамонце Наркамат рачнога флота недавыканаў заданне па перавозцы масавых грузаў у 1940 годзе на 700 мільёнаў тона-кіламетраў.

Скарачэнне прастояў рачнога флота, якія да гэтага часу прадаўжаюць аставацца вельмі высокімі, павышэнне якасці суднарамонту, асабліва ў зімовы перыяд, поўнае скарыстанне магутных водных магістралей Савецкага Саюза з'яўляюцца неадкладнымі задачамі воднага транспарта. У нас ёсць усё неабходнае для таго, каб вялікае заданне па павелічэнню рачных перавозак у 1941 годзе на 28 процантаў воднікі не толькі выканалі, але і перавыканалі.

Такія асноўныя заданні плана 1941 года ў галіне транспарта.

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Пераходжу да пытання капітальнага будаўніцтва. Праграма будаўніцтва і размяшчэння прадпрыемстваў, прынятая на 1941 год Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і Советам Народных Камісараў СССР, прадстаўляе сабой велічны план. Ён падымае народную гаспадарку СССР на вырашэнне новых, буйных задач будаўніцтва соцыялізма.

Праграма капітальных укладанняў у народную гаспадарку СССР перавышае ўзровень 1940 года больш чым у паўтара раза. У гэтай праграме адлюстроўваецца прагрэсіўны рух соцыялістычнага грамадства. Чым выклікан такі значны рост капітальных укладанняў? — Ён выклікан самымі надзённымі патрэбнасцямі нашага развіцця і расшырэння соцыялістычнай прамысловасці, неабходнасцю паскорыць выкананне задачы перагнаць у эканамічных адносінах галоўныя капіталістычныя краіны.

З агульнага аб'ёма цэнтралізаваных капітальных укладанняў у 48 мільярдаў рублёў укладанні ў прамысловасць складуць 30,6 мільярда рублёў, што перавышае ўзровень 1940 года на 71 проц.

Асабліва быстра растуць капітальныя ўкладанні ў наступныя галіны народнай гаспадаркі:

У чорную металургію	на	122	проц. супроць 1940 года
» каляровую металургію	»	93	» » » »
» нафтавую прамысловасць	»	123	» » » »
» будаўніцтва электрастанцый	»	148	» » » »
» машынабудаўніцтва	»	102	» » » »

З структуры капітальных укладанняў вы ясна бачыце палітыку нашай партыі, разлічаную на далейшы ўздым соцыялістычнай індустрыі, а значыцца, усёй народнай гаспадаркі СССР.

Істотныя зрухі прадугледжвае план 1941 года ў тэрытарыяльным размяшчэнні новых прадпрыемстваў. Аб'ём капітальных работ па саюзных рэспубліках расце ў 1941 годзе ў параўнанні з 1940 годам у наступных размерах:

Па РСФСР рост складзе 50 процантаў. Пры гэтым капіталаўкладанні ў раёнах Урала і Заходняй Сібіры растуць на 58 процантаў, у раёнах паўднёвага ўсхода на 66 процантаў і ў раёнах поўначы і паўночнага захада на 147 процантаў. Тут ствараюцца новыя магутныя прамысловыя базы Савецкага Саюза. Пасля таго як граніца СССР каля Ленінграда выправілена, а безапаснасць Ленінграда сур'ёзна ўмацавалася,—Цэнтральны Камітэт Партыі і Совет Народных Камісараў Саюза ССР палічылі магчымым пайсці ў 1941 годзе на значныя капіталаўкладанні ў прамысловасць Ленінграда і Ленінградскай вобласці.

Па Украінскай ССР капіталаўкладанні ў народную гаспадарку ў 1941 годзе растуць на 76 проц., прычым рост мае месца асабліва ў машынабудаўніцтве, металургіі, хімічнай прамысловасці і на транспарце. Вялікія капітальныя ўкладанні робяцца ў народную гаспадарку Малдаўскай ССР, асабліва ў яе прамысловасць і транспарт.

Па Беларускай ССР капітальныя ўкладанні павялічваюцца на 45 проц. Асабліва быстрае развіццё атрымлівае тут паліўная прамысловасць, машынабудаўніцтва, электрабудаўніцтва і транспарт.

Больш высокія ў параўнанні з сярэднімі па Саюзу намечаны тэмпы росту будаўніцтва па саюзных рэспубліках Закаўказзя. Капітальныя ўкладанні ў народную гаспадарку Грузінскай ССР растуць на 101 проц., Армянскай ССР на 135 проц. і Азербайджанскай ССР на 122 проц. Найбольшыя ўкладанні атрымлівае тут нафтавая прамысловасць, машынабудаўніцтва, чорная і каляровая металургія.

У саюзных рэспубліках Сярэдняй Азіі капітальныя ўкладанні асабліва павялічваюцца ў нафтавую і вугальную прамысловасць, каляровую металургію і ірыгацыйнае будаўніцтва. Капіталаўкладанні ў народную гаспадарку Таджыкскай ССР павялічваюцца на 83 проц., Казахскай ССР—на 51 проц., Кіргізскай ССР—на 132 проц. і Туркменскай ССР—на 72 проц. Найбольшыя па аб'ёму капіталаўкладанні атрымлівае народная гаспадарка Узбекскай ССР. Тут ствараецца мясцовая вугальная база, прадаўжаецца будаўніцтва Чырчыкскіх гідрастанцый і азотнатукавага камбіната.

Па Карэла-Фінскай ССР капіталаўкладанні растуць на 280 процантаў. Найбольш высокімі тэмпамі расце тут будаўніцтва чорнай і каляровай металургіі, электрабудаўніцтва, будаўніцтва лясной і цэлюлозна-папяровай прамысловасці, а таксама транспарта.

Народная гаспадарка Літоўскай ССР, Латвійскай ССР і Эстонскай ССР у 1941 годзе будзе ўпершыню выконваць праграму будаўніцтва соцыялістычных прадпрыемстваў. Вялікае развіццё атрымлівае тут машынабудаўніцтва, паліўная прамысловасць, электрабудаўніцтва і тэкстыльная прамысловасць. Роля соцыялістычнай індустрыі ў народнай гаспадарцы Прыбалтыкі павялічваецца ў поўнай адпаведнасці з інтарэсамі рабочых, сялян і інтэлігенцыі новых соцыялістычных савецкіх рэспублік.

Прадугледжаная планам 1941 года праграма росту капітальных укладанняў да многага абавязвае наркаматы і мясцовыя партыйныя арганізацыі. Неабходна поўнасцю рэалізаваць намечаныя фонды на матэрыялы і абсталяванне, ва ўсю раздуць вытворчасць мясцовых будаўнічых матэрыялаў, своечасова падрыхтаваць кадры будаўнічых рабочых.

У плане капітальных работ 1941 года па СССР прадугледжана будаўніцтва 2.955 новых і расшырэнне існуючых прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку:

Прадаўжаецца і зноў пачынаецца будаўніцтва 2.213 новых прадпрыемстваў.

Расшыраецца і рэканструіруецца 742 дзеючых прадпрыемствы.

Пры такім размаху будаўніцтва новых прадпрыемстваў вельмі важнае значэнне мае арганізацыя правільнай гаспадарчай кааперацыі будучых прадпрыемстваў у межах эканамічнага раёна. Неабходна папярэдзіць прамысловыя наркаматы аб гэтай вельмі важнай задачы. Між тым, наркаматы не праяўляюць клопатаў адносна забеспячэння новых прадпрыемстваў кааперыраванымі пастаўкамі, у тым ліку ліццём, дэталямі і поўфабрыкатамі. Той, хто разлічвае на атрыманне гэтых элементаў вытворчасці са стараны, тым больш з другіх эканамічных раёнаў, можа мець сур'ёзныя выдаткі ў пуску ў эксплаатацыю новага прадпрыемства. Кааперацыя павінна быць прадугледжана наркаматамі і арганізавана перш за ўсё ў межах данага эканамічнага раёна.

У 1941 годзе па дзяржаўнаму плану павінна быць уведзена ў строй на поўную або частковую магутнасць 1.576 прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку 1.151 новае прадпрыемства і 425 рэканструіруемых.

Па асобных галінах прамысловасці дзяржаўны план 1941 года прадугледжвае наступныя заданні па будаўніцтву і ўводу ў дзеянне вытворчых магутнасцей і прадпрыемстваў.

У вугальнай прамысловасці:

— ўвод у дзеянне шахт агульнай магутнасцю ў 27 мільёнаў тон, у тым ліку 22,7 мільёна тон па Наркамату вугальнай прамысловасці.

У нафтавай прамысловасці:

— бурэнне скважын у размеры 3.120 тысяч метраў і ўвод у дзеянне 1938 новых нафтавых скважын з бурэння і 1590 скважын з ліку бездзейнічаючых.

У электрабудаўніцтве план прадугледжвае:

— увод у дзеянне на электрастанцыях 1750 тысяч кіловат новых магутнасцей, у тым ліку па раённых электрастанцыях Наркамата электрастанцый 815 тысяч кіловат.

У чорнай металургіі:

а) увод у дзеянне новых доменных печаў агульнай магутнасцю ў 2.300 тысяч тон чыгуну ў год, мартэнаўскіх печаў магутнасцю ў 2.780 тысяч тон, новых бессемераўскіх канвертэраў, коксавых батарэй, горачапракатных станаў, агламерацыйных лент і жалезнарудных шахт;

б) разгорнутае будаўніцтва новых металургічных заводаў: другога металургічнага завода ў Сібіры, двух заводаў на Урале, заводаў — у Закаўказзі, Карэла-Фінскай ССР і ў Ленінградскай вобласці.

У машынабудаўніцтве:

а) будаўніцтва завода цяжкага машынабудаўніцтва ў Сібіры, завода цяжкіх кранаў у Сібіры, завода цяжкіх паковак на Украіне, 3 заводаў кузнечна-прэсавага абсталявання на Украіне, 2 заводаў кузнечна-прэсавага абсталявання на Урале, а таксама—у Паволжы і Заходняй Сібіры;

б) будаўніцтва новых станкабудаўнічых заводаў: цяжкіх станкоў на Урале і ў Сібіры, расточных станкоў у Сібіры, аўтаматаў і рэвальверных станкоў на Урале, шліфавальных станкоў у Варонежскай вобласці, прэцызійных станкоў у Пензенскай вобласці, заводаў — працяжных станкоў, зубарэзных станкоў і буйных такарных станкоў у Паволжы, завода прадольна-строгальных станкоў і завода аўтаматаў і поўаўтаматаў у Сібіры, завода такарных станкоў у Разанскай вобласці і агрэгатных станкоў у Яраслаўскай вобласці;

в) будаўніцтва заводаў электраапаратуры: трансфарматарнага на Урале, завода нізкавольтнай апаратуры ў Паволжы, завода электраматораў у Сібіры, электравымяральных прыбораў у Краснадарскім краі і завода рэле і аўтаматыкі ў Паволжы.

У тэкстыльнай прамысловасці:

а) увод у дзеянне 850 тысяч бавоўнапрадзільных верацён;

б) будаўніцтва баваўнянапапяровых камбінатаў у Сталінску, Барнауле, Ташкенце і Краснаярску, бельтынгавага камбіната ў Астрахані і корднай фабрыкі ў Яраслаўлі.

Для выканання плана капітальных работ патрабуецца рашучае паляпшэнне работы Наркамата па будаўніцтву і будаўнічых арганізацый.

Велізарныя магчымасці выканання плана капітальных работ закладзены ў скарасным будаўніцтве. Прывяду ў якасці прыкладу будаўніцтва новага вытворчага корпуса Наркаматам узбраення.

У снежні 1940 года наркамат атрымаў ад урада заданне пабудаваць новы вытворчы корпус к 1 красавіка 1941 года, гэта значыць нямнога больш чым за тры месяцы. Корпус павінен мець 19,5 тысячы квадратных метраў з некалькімі тысячамі рабочых у кожнай змене.

Наркамат арганізаваў будаўніцтва корпуса з прымяненнем аблегчаных стандартных канструкцый для дасягнення максімальнай эканоміі матэрыялаў і быстрага ўводу ў дзеянне будоўлі. Праект збудавання складзен і зацверджан за 10 дзён. Увесь падрыхтоўчы да будаўніцтва перыяд быў таксама прароблен за 10 дзён, прычым усе металаканструкцыі былі зроблены на будоўлі ўласнымі сіламі будаўнікоў.

Вага ўсіх матэрыялаў, патрэбных для будаўніцтва, скарочана супроць звычайных норм у пяць раз, расход метала не перавышае расходу ў звычайным жалезабетонным збудаванні. За кошт малай працаёмкасці работ і максімальнай стандартызацыі колькасці рабочай сілы патрабавалася ўтрая менш звычайнага.

У снежні 1940 года не было яшчэ ніякіх слядоў будаўніцтва. У лютым 1941 года ўжо высяцца сцены корпуса, ідзе зборка канструкцый, прычым будаўнікі абавязваюцца закончыць корпус к канцу сакавіка 1941 года, гэта значыць у заданы тэрмін.

Гэты вопыт паказвае, што ўсе нашы заводы сярэдняй магутнасці могуць быць безумоўна ўвадзімы ў дзеянне на працягу аднаго года.

План капітальных работ 1941 года зыходзіць з таго, што будаўнікі, партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны рассунуць і ліквідаваць вузкія месцы ў будаўніцтве. Таварыш Сталін не раз указваў нам, што планы не могуць быць статычнымі, гэта значыць апірацца толькі на дасягнутыя рэсурсы. Няма горш «дзеяча», які валочыцца за жыццём замест таго, каб яго арганізоўваць і ісці ўперад. Нашы планы павінны быць дынамічнымі, каб людзі, ажыццяўляючыя гэтыя планы, вялі справу ўперад, перамагаючы цяжкасці і ўмнажаючы нашы магчымасці.

Такія задачы плана 1941 года ў галіне капітальнага будаўніцтва.

МАТЭРЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫ ЎЗРОВЕНЬ НАРОДАЎ СССР

Пераходжу да пытання аб матэрыяльна-культурным узроўні народаў СССР.

Сістэматычны рост у нашай краіне народнага даходу, значыцца, грамадскага багацця і асабістага спажывання працоўных з'яўляецца рэзультатам уцягнення ў вытворчасць усё новых кадраў рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі і пад'ёма прадукцыйнай сілы працы.

Колькаснасць рабочага класа ў СССР расце з года ў год. Колькасць рабочых і служачых у народнай гаспадарцы павялічылася ў 1940 годзе да 30,4 мільёна чалавек супроць 27 мільёнаў чалавек у 1937 годзе. План 1941 года прадугледжвае павелічэнне колькаснасці рабочых і служачых да 31,6 мільёна чалавек.

Далейшае развіццё прамысловасці патрабуе сістэматычнага папаўнення рабочага класа новымі кваліфікаванымі кадрамі і правільнага размеркавання рабочай сілы паміж галінамі і раёнамі ў адпаведнасці з інтарэсамі народнай гаспадаркі.

Па ініцыятыве таварыша Сталіна партыя і ўрад у 1940 годзе прыступілі да стварэння дзяржаўных працоўных рэзерваў шляхам падрыхтоўкі маладых кваліфікаваных кадраў у рамесленых вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння.

(Працяг даклада тав. Н. А. Вазнесенскага на 4 стар.).

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)

Гаспадарчыя вынікі 1940 года і план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1941 год

Даклад тав. Н. А. ВАЗНЕСЕНСКАГА

У 1941 годзе намечан дадатковы набор у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы ў колькасці 350 тысяч чалавек і ў школы фабрычна-заводскага абучэння — 537 тысяч чалавек. Ужо ў 1941 годзе соцыялістычная прамысловасць атрымае папаўненне ў выглядзе маладых кваліфікаваных рабочых, скончыўшых школы фабрычна-заводскага абучэння, у колькасці 794 тысяч чалавек.

Мерапрыемствы партыі і ўрада па стварэнню дзяржаўных працоўных рэзерваў маюць велізарнае прынцыповае значэнне ў справе колькаснага і якаснага фарміравання рабочага класа, далейшага ўздыму нашай прамысловасці і пастаноўкі на моцную аснову ўсёй справы соцыялістычнага планіравання народнай гаспадаркі.

Фонды заработнай платы рабочых і служачых па ўсёй народнай гаспадарцы СССР у 1941 годзе павялічваюцца супроць папярэдняга года на 14 мільярдаў рублёў і складуць па ўсёй гаспадарцы звыш 175 мільярдаў рублёў. Гэты велізарны рост заработнай платы рабочых і служачых суправаджаецца і забяспечваецца ўздымам прадукцыйнасці працы.

У плане 1941 года намячаецца павышэнне прадукцыйнасці працы на 12 процантаў пры росце сярэдняй заработнай платы на аднаго рабочага на 6,5 процанта. Гэтыя суадносіны паміж ростам прадукцыйнасці працы і сярэдняй заработнай платы з'яўляюцца крыніцай зніжэння сабекошту, росту соцыялістычнага накаплення і важнейшай умовай ажыццяўлення высокіх тэмпаў расшыранага соцыялістычнага ўзнаўлення.

Неабходнасць апярэджвання росту прадукцыйнасці працы ў параўнанні з ростам заработнай платы зусім відавочна: каб развіваць свае прадукцыйныя сілы, народ павінен выпрацаць больш таго, што ён скарыстоўвае на працягу данага года ў парадку асабістага спажывання.

Розвічны тавараабарот дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю ў 1941 годзе ў горадзе і вёсцы складзе каля 197 мільярдаў рублёў, што азначае рост супроць 1940 года на 22,5 мільярда рублёў. Рост рознічнага тавараабароту асноўван на павелічэнні вытворчасці прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, на растучых даходах рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі.

Рашэнне Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў СССР аб мерапрыемствах па павелічэнню вырабу прадметаў шырокага спажывання і харчавання з мясцовай сыравіны павінна развязаць мясцовую ініцыятыву ў справе дадатковага павелічэння прамысловых і харчовых рэсурсаў і паслужыць новай крыніцай росту тавараабароту ў краіне. Усямернае разгортванне тавараабароту і ліквідацыя бюракратычных скажэнняў у гандлі паранейшаму з'яўляецца важнейшай задачай партыйных, совецкіх і гандлёвых арганізацый.

Побач з ростам матэрыяльнага добрабыту адбываецца далейшы ўздым культурнага ўзроўню народаў СССР. Дзяржаўныя асігнаванні на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы, якія склалі ў 1938 годзе 35,2 мільярда рублёў, узраслі ў 1940 годзе да 41,7 мільярда рублёў або на 18,5 проданта. Праектам дзяржаўнага бюджэта 1941 года расходы на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы павялічваюцца да 47,8 мільярда рублёў, што азначае рост супроць папярэдняга года на 14,6 процанта.

Культурны рост народаў Совецкага Саюза характарызуецца далейшым ростам ліку навучаючыхся ў школах і ВНУ. Лік навучаючыхся ў пачатковых і сярэдніх школах агульнай адукацыі ў 1941—42 годзе дасягне 36,2 мільёна чалавек або павялічыцца супроць 1940—41 года на 3,4 процанта. Лік навучаючыхся ў ВНУ дасягне 657.000 чалавек або павялічыцца амаль на 13 процантаў.

Рост ліку навучаючыхся ў 1941 годзе і далейшае насычэнне народнай гаспадаркі інжынерамі і тэхнікамі паслужыць яшчэ адным крокам уперад у справе ўздыму культурна-тэхнічнага ўзроўню народаў Совецкага Саюза.

Рашаючай прадукцыйнай сілай нашага грамадства з'яўляецца сам народ, яго культура і вытворчая кваліфікацыя.

За годы пяцігодак совецкі народ выключна вырас па сваёй культуры і тэхнічных навыках. У гэтых адносінах вельмі цікавы даныя перапісу насельніцтва СССР.

Як вядома, згодна рэзультатаў перапісу насельніцтва Совецкага Саюза за перыяд з 1926 года да 1939 года вырасла на 16 процантаў.

Але паглядзіце, якімі тэмпамі павялічыліся за той-жа перыяд кваліфікаваныя кадры рабочых і інтэлігенцыі Совецкага Саюза:

а) рабочыя:

колькасць	слесараў	павялічылася	ў 3,7 раза
»	токараў	»	у 6,8 »
»	фрэзероўшчыкаў	»	у 13 »
»	машыністаў	»	у 4,4 »
»	штукатураў	»	у 7 »
»	трактарыстаў	»	у 215 »

б) інтэлігенцыя:

колькасць	інжынераў	павялічылася	ў 7,7 раза
»	аграномаў	»	у 5 »
»	навуковых работнікаў	»	у 7,1 »
»	настаўнікаў	»	у 3,5 »
»	урачоў	»	у 2,3 »

Такія важнейшыя паказальнікі росту матэрыяльна-культурнага ўзроўню народаў СССР.

Таварышы! Вялікія поспехі народнай гаспадаркі Саюза ССР, дасягнутыя ў 1940 годзе. Гэтымі поспехамі краіна абавязана нашаму гераічнаму народу, нашай комуністычнай партыі большэвікоў і правадыру народаў таварышу Сталіну. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты).**

Але яшчэ больш значныя задачы нашага развіцця, якія прадстаіць ажыццявіць у 1941 годзе. Рашаючай умовай выканання задач, пастаўленых планам, з'яўляецца кантроль і праверка выканання прынятага плана на кожным прадпрыемстве, у кожным калгасе, у кожнай партыйнай арганізацыі. Гэта з'яўляецца самай надзейнай гарантыяй барацьбы з бюракратызмам, гарантыяй нашага неўхіліагага руху ўперад к комунізму.

Гістарычныя задачы 1941 года будуць вырашаны народамі Совецкага Саюза на чале з нашай партыяй, з нашым Сталіным! **(Усе ўстаюць. Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, воклічы: «Ура, таварышу Сталіну!»).**

ГАСПАДАРЧЫЯ ВЫНІКІ 1940 ГОДА І ПЛАН РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СССР НА 1941 ГОД

Рэзалюцыя па дакладу тав. Вазнесенскага, прынятая XVIII Усесаюзнай канферэнцыяй ВКП(б)

I. ВЫНІКІ 1940 ГОДА

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) адзначае, што ў 1940 годзе народная гаспадарка СССР значна прасунулася ўперад у вырашэнні задач, пастаўленых трэцім пяцігадовым планам, прынятым XVIII з'ездам ВКП(б).

Прадукцыя прамысловасці СССР вырасла за тры годы трэцяй пяцігодкі з 95,5 мільярда рублёў у 1937 годзе да 137,5 мільярда ў 1940 годзе або на 44 проданты, у тым ліку прадукцыя машынабудаўніцтва і металаапрацоўкі вырасла на 76 процантаў.

У 1940 годзе, не гледзячы на ваенныя дзеянні, якія прадаўжаліся ў пачатку года, прамысловая прадукцыя СССР вырасла на 11 процантаў або на 13,6 мільярда рублёў супроць 1939 года, у тым ліку прадукцыя машынабудаўніцтва і металаапрацоўкі — на 19 процантаў. Тэмпы росту прамысловай прадукцыі ўзрасталі з месяца ў месяц на працягу ўсяго 1940 года.

Вытворчасць сродкаў вытворчасці ў 1940 годзе вырасла на 13,8 процанта супроць 1939 года і на 52 проданты супроць 1937 года. Вытворчасць сродкаў спажывання вырасла ў 1940 годзе на 7 процантаў супроць 1939 года і на 33 проданты супроць 1937 года.

Чорная металургія з другой палавіны 1940 года пачала прыкметна паляпшаць сваю работу, дасягнуўшы к канцу 1940 года сярэднесутачнай выплаўкі чыгуну ў 46—47 тысяч тон супроць 40 тысяч тон у канцы 1937 года і па сталі 58—59 тысяч тон супроць 50—51 тысячы тон.

Палепшыла таксама сваю работу каляровая металургія. Выплаўка алюмінія ў 1940 годзе вырасла супроць 1937 года на 59 процантаў, медзі на 65 процантаў, нікеля на 280 процантаў і волава на 300 процантаў.

Аднак, павелічэнне вытворчасці метала адстае ад заданняў трэцяга пяцігадовага плана і яшчэ не забяспечвае растучых патрэб народнай гаспадаркі СССР.

Вырасла, асабліва за другую палавіну 1940 года, вугальная прамысловасць СССР. Прырост здабычы вугалю за год склаў 13 процантаў або амаль 19 мільёнаў тон супроць узроўню 1939 года. З другой палавіны 1940 года пачалося паляпшэнне ў нафтавай прамысловасці, прычым к канцу года сярэднесутачная здабыча павысілася да 97—98 тысяч тон супроць 84—86 тысяч тон у канцы 1937 года. Аднак, адставанне нафтавай прамысловасці ад заданняў трэцяй пяцігодкі яшчэ не ўстаронена.

Мерапрыемствы, праведзеныя ЦК ВКП(б) і СНК СССР па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны і павелічэнню рабочага часу на прадпрыемствах і ва ўстановах, прывялі да далейшага росту прадукцыйнасці працы і стварылі ўмовы для новага ўздыму прамысловасці. Аднак, магчымасці росту прадукцыйнасці працы і павелічэння вытворчасці далёка не скарыстаны радам галін прамысловасці, асабліва лясной прамысловасцю і прамысловасцю будаўнічых матэрыялаў, якія рэзка недавыканалі план 1940 года і з'яўляюцца адстаючымі галінамі прамысловасці.

За 1940 год чыгуначныя перавозкі выраслі з 392 мільярдаў тона-кілометраў у 1939 годзе да 409 мільярдаў тона-кілометраў у 1940 годзе. Рачныя перавозкі павялічыліся да 36 мільярдаў тона-кілометраў супроць 33 мільярдаў тона-кілометраў у 1937 годзе і 34,6 мільярда тона-кілометраў у 1939 годзе. Аднак, у рабоце чыгуначнага транспарта маюць месца сур'ёзныя дэфекты: прадаўжаюцца нерацыянальныя перавозкі, якія загружаюць транспарт, не ліквідаваны вузкія месцы ў прапускной здольнасці раду вузлоў і напрамкаў.

Вырасла валавая прадукцыя зярна, цукровых буракоў, сланечніка, бульбы і гароднін. Прадукцыя зернавых культур па СССР у 1940 годзе склала каля 7,3 мільярда пудоў.

Вырасла ў 1940 годзе пагалоўе жывёлы ў калгасах — буйной рагатай жывёлы на 12 проц., свіней на 15 проц., авечак на 25 проц. і коз на 34 проц. Грамадская калгасная жывёлагадоўля ўпэўнена павышае сваю долю ва ўсім пагалоўі жывёлы ў краіне.

Расце матэрыяльны і культурны ўзровень працоўных СССР. Фонд заработнай платы рабочых і служачых у СССР павялічыўся ў 1940 годзе да 123,7 мільярда рублёў супроць 82,2 мільярда рублёў у 1937 годзе і 116,5 мільярда рублёў у 1939 годзе. Павялічыліся грамадскія даходы калгасаў і асабістыя даходы калгаснікаў.

Аб'ём капітальных укладанняў па будаўніцтву новых прадпрыемстваў склаў у 1940 годзе амаль 38 мільярдаў рублёў (у тым ліку каля 6 мільярдаў рублёў па нецэнтралізаваных капітальных укладаннях), а ўсяго за тры годы трэцяй пяцігодкі 108 мільярдаў рублёў (у тым ліку 17,5 мільярда рублёў па нецэнтралізаваных капітальных укладаннях). За гэтыя тры годы ўступілі ў строй у дзяржаўнай прамысловасці сотні фабрык, заводаў, шахт, электрастанцый і другіх прадпрыемстваў, у рэзультаце чаго ўведзена ў дзеянне 51 мільён тон магутнасці па здабычы вугалю на новых шахтах, каля 2.400 тысяч кіловат магутнасцей на электрастанцыях, доменных пячэй магутнасцю ў 2.900 тысяч тон чыгуну, каля 1 мільёна бавоўнянапрадзільных верацён.

II. ГАСПАДАРЧЫ ПЛАН НА 1941 ГОД

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) лічыць галоўнай гаспадарчай задачай 1941 года далейшы рост асноўных галін прамысловасці і ўсёй народнай гаспадаркі — металургіі, машынабудаўніцтва, сельскай гаспадаркі, траспарта. Асабліва неабходзен далейшы рост вытворчасці чыгуну, сталі, каляровых металаў, вугалю, нафты і максімальнае развіццё машынабудаўніцтва ўсіх відаў.

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) адабрае прыняты ЦК ВКП(б) і СНК СССР дзяржаўны план развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1941 год і прапануе партыйным, совецкім і гаспадарчым арганізацыям сканцэнтраваць увагу і сілы на вырашэнні наступных гаспадарчых задач 1941 года:

1. Давесці выпуск валавой прадукцыі прамысловасці СССР да 162 мільярдаў рублёў з ростам супроць узроўню 1940 года на 17—18 проц., у тым ліку па групе сродкаў вытворчасці на 23,5 проц. і па групе прадметаў спажывання на 9 проц.

2. Павялічыць вытворчасць чыгуну да 18 мільёнаў тон, выплаўку сталі — 22,4 мільёна тон і вытворчасць пракату — 15,8 мільёна тон.

3. Забяспечыць здабычу вугалю ў размеры 191 мільёна тон, нафты з газам — 38 мільёнаў тон і торфу — 39 мільёнаў тон.

4. Забяспечыць рост прадукцыі машынабудаўніцтва супроць 1940 года на 26 проц.

5. Забяспечыць прырост магутнасцей электрастанцый на 1,75 мільёна кіловат.

6. Павялічыць магутнасць бавоўнянапаяровай прамысловасці на 850 тысяч прадзільных верацён.

7. Павялічыць валавую прадукцыю зернавых культур на 8 проц.

8. Забяспечыць сярэднесутачную пагрузку на чыгунках у размеры 103 тысяч вагонаў. Пераадалець адставанне ад патрэбнасцей народнай гаспадаркі ў развіцці перавозак воднага транспарта.

9. Павялічыць рознічны тавараабарот дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю да 197 мільярдаў рублёў.

10. Павялічыць прадукцыйнасць працы ў прамысловасці і будаўніцтве на 12 проц.

11. Знізіць сабекошт прамысловай прадукцыі на 3,7 проц. і забяспечыць за гэты кошт дадатковае накапленне ў прамысловасці ў размеры 7,3 мільярда рублёў.

12. Павялічыць лік навучаючыхся ў пачатковых і сярэдніх школах да 36,2 мільёна чалавек і ў вышэйшых навучальных установах да 657 тысяч чалавек з тым, каб давесці агульныя расходы на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы да 48 мільярдаў рублёў.

13. Выканаць праграму капітальных укладанняў у размеры 57 мільярдаў рублёў (у тым ліку 9 мільярдаў рублёў па нецэнтралізаваных капітальных укладаннях).

14. Забяспечыць далейшае павелічэнне матэрыяльных і фінансавых дзяржаўных рэзерваў.

* * *

XVIII Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б) выражае цвёрдую ўпэўненасць, што ўсе партыйныя арганізацыі яшчэ больш разгорнуць соцыялістычнае спаборніцтва ў рабочым класе, калгасным сялянстве і сярод інтэлігенцыі і забяспечаць выкананне і перавыкананне плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1941 год.

Спрэчкі 18 лютага па дакладу тав. Маленкова аб задачах партыйных арганізацый у галіне прамысловасці і транспарта

Прамова тав. ПАНАМАРЭНКА*)

Таварышы! Пасля XVIII з'езда партыі прамысловасць Беларусі прадаўжала няўхільна расці і прадаўжаў павялічвацца аб'ём прамысловай прадукцыі. За 1940 год аб'ём прамысловай вытворчасці рэспублікі ўзрос на 15 процантаў. У заходніх абласцях Беларусі, якія нядаўна знаходзіліся на становішчы калоніі былой польскай дзяржавы, за першы год існавання совецкай улады аб'ём прамысловай вытворчасці вырас амаль у два з палавінай раза. Узрасла мясцовая прамысловасць рэспублікі.

У 1940 годзе створана 839 прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааператыўных арцелей. Многія галіны прамысловасці і прадпрыемствы значна палепшылі сваю работу, выканалі план і дабіліся павелічэння аб'ёму вытворчасці. Лесазагатоўчая і лесаапрацоўчая прамысловасць у 1940 годзе павялічыла выпуск прадукцыі ў параўнанні з 1939 годам на 53 проданты. У 1941 годзе прырост прадукцыі лясной прамысловасці к 1939 году складзе 225 процантаў. Такі прырост лясной прадукцыі мае тым большае значэнне, што лясная прамысловасць Беларусі займае вялікую ўдзельную вагу ў лясной прамысловасці Саюза і размешчана найбольш блізка да важных прамысловых раёнаў Саюза.

Студзеньскі план па загатоўцы лесу выканан на 125 процантаў і па вывазцы — на 133 проданты. Гэта дазволіць значна палепшыць снабжэнне лесаматэрыяламі металургічнай, нафтавай і іншых галін прамысловасці Совецкага Саюза. Гэта стварыла таксама ўмовы для рэзкага паляпшэння работы ўсіх галін лясной прамысловасці. Раней адстаўшая запалкавая прамысловасць цяпер перавыконвае план. Перавыконваюць планы таксама іншыя галіны лясной прамысловасці: фанера, мэбля і т. д.

Тэкстыльная прамысловасць Беларусі ў 1940 годзе выканала план на 102 проданты. Вялікіх поспехаў дабіліся беластоцкія тэкстыльшчыкі, якія выканалі гадавое заданне на 105 процантаў, не гледзячы на тое, што ў гэты перыяд праводзілася рэканструкцыя беластоцкай тэкстыльнай прамысловасці, у рэзультаце якой з 95 дробных саматужных прадпрыемстваў створана 25 сярэдніх і буйных тэкстыльных прадпрыемстваў.

Некалькі палепшылі таксама сваю работу лёгкая, харчовая і паліўная прамысловасць. Аднак цэлы рад галін прамысловасці і многа прамысловых прадпрыемстваў Беларусі працуе нездавальняюча. Прамысловасць будматэрыялаў, шкляная, металаапрацоўчая і некаторыя іншыя не выканалі плана ні па валавой прадукцыі, ні па асартыменту. Праверка работы гэтых галін прамысловасці паказала, што там пануе расхлябанасць, запушчанасць арганізацыйна-тэхнічнага кіраўніцтва, а з прычыны гэтага велізарныя прастоі, перарасход сыравіны, матэрыялаў, паліва, вялікія страты ад браку. Многія прадпрыемствы будматэрыялаў мелі велізарныя прастоі з прычыны адсутнасці паліва, у той час як калі-б яны праявілі належныя клопаты, то маглі-б запасці торфу стольнкі, колькі ім патрэбна.

У запалкавай прамысловасці толькі з-за таго, што не пераадалелі затрымак у прыёмны запалак набіўнымі цэхамі, мелася звыш 7.000 аўтамата-гадзін прастояў. У выніку краіна страціла 200 тысяч скрынак запалак.

У шкляной прамысловасці страты ад браку і боя за 1940 год складалі 1.358 тысяч рублёў, што перавышае аб'ём вытворчасці вялікага шклозавода.

У лясной прамысловасці сотні машын і трактараў прастойваюць у выніку адсутнасці планава-папераджальнага рамонту, недастатковай падвозкі драўніны к трасам, нясвоечасовай разгрузкі і іншых прычын.

Зусім незразумела існуючая ў лясной прамысловасці недаацэнка такога важнейшага віду механізацыі лесараспрацовак, як пераносныя рэльсавыя вузкакалейныя пуці.

Па Наркомлесу Беларусі сабекошт вывазкі лесу за дзевяць месяцаў 1940 года характарызуецца наступнымі цыфрамі:

Вывазка	трактарамі	— 2 р. 67 к.	куба-кілометр;
»	аўтамашынамі	— 1 р. 30 к.	»
»	па вузкакалейках	— 29 к.	»

Такім чынам, вывазка па вузкакалейках абходзіцца ў 9 раз дзешавей, чым вывазка трактарамі.

Прымяненне вузкакалейных дарог нават з коннай цягай ва ўмовах Беларусі стварыла-б круглагадавую эксплаатацыю масіваў, зняло-б у вялікай меры залежнасць лясной прамысловасці ад гумы, бензіна, высвабадзіла-б іх для іншых галін прамысловасці, дазволіла-б пачаць прамысловую лесараспрацоўку масіваў, якія не могуць распрацоўвацца пры трактарнай і аўтамабільнай цязе. Напрыклад, у Беларусі слаба распрацоўваюцца лясныя багацці Палесся, дзе ў адным Тураўскім лесамасіве каля 7 мільёнаў кубаметраў перастоялай драўніны каштоўнейшых парод (у тым ліку ў вялікай колькасці дуб). Дастаткова звязаць вузкакалейкай масівы з ракой Прыпяццю і бліжэйшай чыгункай, каб даць выхад велізарнай колькасці лесу.

Наркомлесу СССР трэба было-б у бліжэйшыя годы значна павялічыць прымяненне вузкакалейных рэльсавых пуцей на лесараспрацоўках.

Заслугоўвае сур'ёзнай увагі становішча спраў у лесахімічнай прамысловасці промкааперацыі. Як гэта ні дзіўна, у апошнія годы выраб важнейшых прадуктаў лесахіміі пачаў скарачацца.

Адбылося гэта таму, што промкааператыўнай прамысловасці, якая дае большасць прадуктаў лясной хіміі, не ўдзялялася ўвагі, яе існаванне неяк нават у разлік не прымалася, яе нашы райкомы партыі, уласна, і за прамысловасць не лічылі, і вытворчасць паступова скарачалася.

Дарэчы сказаць, многія райкомы партыі лічаць свае раёны толькі сельскагаспадарчымі. Калі няма буйных прадпрыемстваў, значыць няма, моў, прамысловасці. Між тым у любым такім раёне ёсць дзесяткі дробных і нават сярэдніх прадпрыемстваў, у прадукцыі якіх дзяржава мае вялікую патрэбу і на якой часта аснавана ў пэўнай меры работа і буйных прадпрыемстваў. Напрыклад. Рагачоўскі раён Беларусі здаўна лічыцца сельскагаспадарчым. Партыйныя арганізацыі займаліся выключна сельскай гаспадаркай, а між тым у раёне ёсць 18 прадпрыемстваў, у тым ліку малочна-кансервны завод, лесапільны, тры ільнозаводы, картонная фабрыка, цагельныя заводы, чыгуначны вузел, прамысловыя арцелі.

Неабходна змяніць адносіны партарганізацый сельскіх раёнаў да сваёй прамысловасці, якая зараз створана паўсямесна і адыгрывае вялікую ролю ў народнай гаспадарцы. Адною з такіх галін прамысловасці, пашыранай у сельскіх раёнах, з'яўляецца лесахімія.

У Беларусі ёсць 65 промкааператыўных арцелей, выпрацоўваючых прадукты лесахіміі. Гэтыя арцелі здабываюць шляхам перакуркі сасновых пнёў і перапрацоўкі адыходаў ліставых парод драўніны скіпідар, сасновы вугаль, меціловы спірт, воцатны парашок, вугальны парашок, флатацыйнае масла, якое з'яўляецца ўзбагачальнікам руд пры здабычы каляровых металаў, гудрон і многія іншыя прадукты.

Калі вывучылі глыбей пытанні лесахіміі, аказалася, што пры невялікіх мерах дапамогі мы можам прадукцыю гэтай прамысловасці ўжо ў гэтым годзе падвоіць. Па Саюзу таксама лёгка падвоіць здабычу скіпідара.

Недахопы ў рабоце мясцовай паліўнай прамысловасці сур'ёзна тармозяць работу многіх галін прамысловасці. Удзельная вага торфу ў паліўным балансе Беларусі ў 1940 годзе вырасла да 64 процантаў. Торф амаль выцесніў дальнепрывозны вугаль.

Велізарным недахопам у рабоце тарфяной прамысловасці з'яўляецца тое, што пры існуючых непарадках у здабычы торфу і яго транспартыроўцы ён прадаўжае быць больш дарагім палівам, чым вугаль.

Высокі кошт торфу тлумачыцца нізкай механізацыяй працэсаў здабычы, сушкі, уборкі торфу і пагрузачна-разгрузачных работ. Калі процант механізацыі тарфяной прамысловасці ў Саюзе ў 1937 годзе дасягнуў 72 процантаў, то ў Беларусі ён быў роўны 33 процантам.

Вельмі падаражае торф таксама транспарт. Будучы вельмі аб'ёмным палівам, торф патрабуе для перавозкі велізарнай колькасці вагонаў.

Мы павінны дабіцца значнага зніжэння кошту торфу шляхам удасканалення і механізацыі працэсаў здабычы, сушкі, уборкі, пагрузкі і выгрузкі торфу і развіцця торфабрыкетыравання.

Важнае значэнне мае брыкетыраванне торфу. Танны фрэзерны торф, пераўтвораны ў брыкет, становіцца высокакаларыйным і малааб'ёмным палівам. Цеплатворная здольнасць тарфянога брыкета складае да $4^1/_2$ тысяч калорый на кілограм, г. зн. яна ў два разы вышэй торфу. Для спажывання ў быту брыкет з'яўляецца, бадай, самым лепшым відам паліва. Адна тона брыкета замяняе 3—4 кубаметры дроў; брыкет гігіенічны, яго не трэба піліць і калоць, захоўваць можна дзе хочаш.

Такое паліва прадстаўляе цікавасць з пункту гледжання стварэння запасаў. Яно высокакаларыйнае і можа спажывацца дзе хочаш: у топках паравозаў, у кацельных прадпрыемстваў. Яно не падвержана самаўзгаранню.

Выключныя перспектывы адкрываюцца ў прымяненні торфабрыкета як паліва ў газагенератарных аўтамабілях і трактарах. Доследы паказалі, што газагенератарная машына «ЗІС-21» на 100 кілометраў прабегу расходуе брыкета ад 35 да 50 кілаграмаў. Машына з поўнай нагрузкай, пры ўмяшчальнасці бункера 120 кілаграмаў, за адну запраўку праходзіць 250—270 кілометраў. Кошт прабегу на торфабрыкеце дзешавей у 6 — 7 раз у параўнанні з коштам прабегу на бензіне.

У бліжэйшы час торфабрыкетыраванне павінна атрымаць самае шырокае развіццё ў СССР.

У рашэннях XVIII з'езда ВКП(б) падкрэслена важнейшая задача стварэння новых галін арганічнага сінтэза. У святле гэтага ўказання атрыманне сінтэтычнага бензіна з торфу, запасы якога ў нас невычарпальны, мае вялікае народна-гаспадарчае значэнне.

У радзе краін сінтэз бензіна з газаў прыняў шырокія размеры. У якасці сыравіны для сінтэза скарыстоўваецца пераважна малакаштоўнае паліва, як, напрыклад, бурыя вугалі.

Даказана, што газіфікацыя торфу праходзіць не трудней, чым газіфікацыя бурых вугалей, і дае такі-ж выходны газ, годны для атрымання сінтэтычнага бензіна.

У выглядзе адыходаў пры вырабе бензіна з торфу атрымліваецца тарфяны кокс, зусім прыгодны для металургічных мэт, полімеры, парафін і смала.

Гэтыя важныя навукова-абгрунтаваныя і практычна правераныя вывады для вырашэння пытання аб прамысловым вырабе бензіна з торфу на працягу некалькіх год затрымліваліся ў навукова-даследчых установах і толькі зараз атрымліваюць практычнае вырашэнне ў выніку актыўнага ўмяшання партыйных органаў. Сабекошт такога бензіна будзе вышэй сабекошту бензіна, атрымліваемага з нафты.

Вядома, што многія сінтэтычныя прадукты даражэй натуральных. Аднак гэта не служыць, па зусім зразумелых меркаваннях, перашкодай для развіцця сінтэза. Гэта ў роўнай меры адносіцца і да сінтэтычнага бензіна.

З торфу можна і трэба атрымліваць рад іншых хімічных прадуктаў. Пры газіфікацыі торфу ў якасці адыходу атрымліваецца тарфяная смала.

Па Саюзу на шклозаводах і іншых прадпрыемствах штогод накапляюцца дзесяткі тысяч тон тарфяной смалы. На адным Касцюковіцкім заводзе ў Беларусі штогод атрымліваецца 7.000 тон гэтай смалы. Яна зараз спальваецца ў топках. Калісьці славуты рускі хімік Мендэлееў сказаў, што спальваць у топках нафту — гэта спальваць асігнацыі. Тое-ж самае можна сказаць у адносінах да смалы. З смалы можна атрымліваць маторнае паліва, фенолы, крэазол, чорную карболку, воск, воцатнакіслы кальцый і натрый, зміяк, кокс, прыгодны для электродных вугалей, шпалапрапітачнае масла.

Апрача таго, ёсць спосаб атрымання высокаактанавага бензіна шляхам гідрыравання смалы.

Далей тав. Панамарэнка падрабязна аналізіруе магчымасці развіцця ў Беларусі новых галін прамысловасці.

Некалькі заўваг па пытаннях планіравання. Існуючы ў нас улік работы прамысловасці толькі па галінах не дазваляе кіраўнікам вобласці і раёна нават пры веданні становішча спраў на кожным прадпрыемстве мець поўнае ўяўленне па асноўных эканамічных паказальніках аб рабоце ўсёй прамысловасці раёна, вобласці.

Неабходна, каб органы народна-гаспадарчага ўліку завялі ўлік работы ўсёй прамысловасці па асноўных паказальніках таксама і ў тэрытарыяльным разрэзе — раёна, вобласці. Гэта дапамагло-б партыйным органам у кіраўніцтве прамысловасцю і павысіла-б іх адказнасць. Калі зараз папрасіць у органаў народна-гаспадарчага ўліку некаторыя даныя аб рабоце прамысловасці па той ці іншай вобласці ці раёну, ім спатрэбіліся-б спецыяльныя выбаркі. Безумоўна, трэба прызнаць, што такі ўлік усюды існуе, хоць і не афіцыяльны, заведзены явачным парадкам, а таму заўсёды і ўсюды разнастайны і недасканалы.

Між тым у сельскай гаспадарцы існуе апрача галіновага ўліку (у разрэзе наркаматаў, па сельскагаспадарчых культурах, жывёлагадоўлі і т. д.), і тэрытарыяльны ўлік (калгас, сельсовет, раён, вобласць). Гэта дазваляе ведаць не толькі па месяцах, але і па дэкадах, па пяцідзёнках становішча спраў не толькі па асобных галінах сельскай гаспадаркі, але і ў цэлым па раёнах і абласцях.

Неабходна ліквідаваць гэты недахоп у сістэме народна-гаспадарчага ўліку. Улік павінен быць галінным, але трэба мець па асноўных, строга неабходных элементах улік работы прамысловасці і ў тэрытарыяльным разрэзе.

Трэба таксама навесці, нарэшце, парадак у фабрычна-заводскай справаздачнасці. Нельга мірыцца з такім становішчам, калі заводы маюць справаздачнасць, якая складаецца з соцень форм, уключаючых тысячы розных пытанняў, часам не толькі не аблягчаючых, а затрудняючых дырэктару ацэнку становішча на заводзе. К прыкладу, нават такое прадпрыемства, як цагельны завод, мае больш 30 форм справаздачнасці. А самае галоўнае заключаецца ў тым, што гэта справаздачнасць не дае гаспадарнікам дакладнага ўяўлення аб становішчы спраў на прадпрыемстве па асноўных паказальніках яго работы, бо яна з прычыны сваёй грамоздкасці спазняецца на тыдні і месяцы і становіцца па сутнасці здабыткам архіва адразу-ж пасля яе складання.

Далейшае развіццё соцыялістычнай індустрыі, асваенне новых вытворчасцей, развіццё мясцовай прамысловасці — патрабуюць павароту ўвагі партыйных органаў і арганізацый да пытанняў прамысловасці.

Трэба павесці рашучую барацьбу з усякага роду расхлябанасцю, застойнасцю, нячоткасцю і маруднасцю, затрудняючымі рух наперад. Трэба навучыцца заглядваць у заўтрашні дзень кожнага прадпрыемства і бачыць перашкоды ў яго рабоце не тады, калі яны ўжо балюча ўдарылі па прадпрыемствах, а ўстраніць іх у зародку.

Партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў і раёнаў павінны будаваць усю партыйна-масавую работу ў напрамку барацьбы за выкананне праграмы прадпрыемстваў, за выпуск высокаякаснай прадукцыі. Прамой задачай кожнай партыйнай арганізацыі з'яўляюцца забеспячэнне нармальнай работы прадпрыемстваў, будаўніцтва, барацьба з прастоямі, з нарушэннямі вытворчай дысцыпліны. І толькі пад гэтым кутом погляду павінна ацэньвацца работа кожнай партыйнай арганізацыі.

1941 год — чацверты год трэцяй сталінскай пяцігодкі — з'яўляецца годам небывалага развіцця прамысловасці Беларусі ва ўсіх яе галінах.

У Беларусі ўзнікаюць зараз прадпрыемствы па выпуску прадукцыі вялікага дзяржаўнага значэння, прадпрыемствы складанай тэхналогіі. На партыйнай арганізацыі Беларусі ляжыць адказнейшая задача ўсямернага расшырэння і паляпшэння работы існуючай прамысловасці, будавання і пуску ў тэрмін новых заводаў і асваення тэхналогіі новых вытворчасцей.

Беларускі народ, працуючы над ажыццяўленнем гістарычных указанняў таварыша Сталіна, штодзённа адчувае велізарную ўвагу і клопаты з боку ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна.

Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), пад кіраўніцтвам правадыра народа таварыша Сталіна, узброеная рашэннямі XVIII партыйнай канферэнцыі, з чэсцю справіцца з ускладзенымі на яе задачамі. **(Апладысменты).**

*) Скарочаная стэнаграма.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У1701. Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.